Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КАСТРЫЧНІК 16 1933 г. ПАНЯДЗЕЛАК № 229 (4773)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

АДКРЫЛАСЯ УСЕБЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТПРОПНАРАДА

Учора ў Доме Комасветы адкрылася ўсебеларуская культпропнарада. Нараду адкрыў загадчык культпропа ЦК КП(б)Б т. ТАМАРКІН. У прэзідыум нарады выбраны: т. т. ГІКАЛО, ЖАБРОЎСКІ, РАТНЕК, ТАМАРКІН, ГЕРЦОВІЧ, БРАГІНСКІ, ХЕЙФЕЦ, КУШНЕРЭНКА, МАЛЫШЭЎ, СТАШЭНІН, ГЕРЦОВІЧ (Орша), ЛІТВІНАЎ і інш.

З дакладам АБ ЗАДАЧАХ МАРКСІЦКА-ЛЕНІНСКАГА ВЫХАВАННЯ выступіў т. Тамаркін. У сваім дакладзе ён спыніўся на значэнні рэволюцыйнай тэорыі на цяперашнім этапе соцыялістычнага будаўніцтва. Гаворачы аб выніках першага месяца партыйнай вучобы ў гарадах, тав. Тамаркін адзначыў, што больш характэрным для ўсіх партыйных арганізацый з'яўляецца спабясць марксіцка-ленінскай вучобы. Дасягненні яшчэ вельмі нязначныя.

Асноўным і галоўным недахопам з'яўляецца адсутнасць кіраўніцтва, адсутнасць рашучай барацьбы за арганізацыю марксіцка-ленінскай вучобы. Вельмі часта гэта тлумачыцца няздольнасцю культпропаў райкомаў і партакактываў арганізаваць партвучобу. Дакладчык прыводзіць надзвычайна яркія факты дрэннай работы асобных палітшкол. Асабліва падрабязна тав. Тамаркін спыніўся на пытаннях аб камплектаванні школ, аб прапагандыстах, партвучобе партыйнага актыва і аб дапамозе комсамолу.

Пасля даклада тав. Тамаркіна пачаліся спрэчкі. Сёння пасяджэнне культпропнарады пачнецца ў 9 гадз. раніцы.

МАГУТНЫ ВАГАР УЗНЯЦЦЯ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ПРАЦЫ

Перадавыя рабочыя горада Леніна звярнуліся з заклікам — разгарнуць барацьбу за ўшчыльненне РАБОЧАГА дня, за тое, каб 420 хвілін цалкам скарыстаць для творчай работы.

У СССР створана высокакласная соцыялістычная тэхніка, якую трэба асвоіць.

А што азначае асвоіць тэхніку? Гэта значыць выкарыстаць поўна і рацыянальна яе магутнасць, атрымаць ад тэхнікі максімум вытворчага эфекта.

У нас для гэтага ёсць усе асноўныя ўмовы. Аб іх гаварыў тав. СТАЛІН у сваёй навеці пістарычных умовах. «Ліквідаваць абязлічку, палепшыць арганізацыю працы, правільна расставіць сілы на прадпрыемстве і г. д.». ШТО ДЛЯ ГЭТАГА НЕАБХОДНА? Рацыянальна арганізаваць працу рабочага, устанавіць найбольш прадукцыйны рэжым работы, вызначыць рабочаму яго вытворчыя паводзіны, поўнае чарганне работы і адпачынка, пабудаваць зарплату так, каб яна служыла матэрыяльным стымулам ва ўзняцці прадукцыйнасці працы і палепшэнні якасці работы.

Усе гэтыя надзенныя пытанні якраз вырашаюцца правільна пастаўленым тэхнічным нармаваннем.

ТЭХНІЧНАЕ НАРМАВАННЕ — ВАЖНЕЙШЫ ВАГАР РАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАБУДОВЫ ПРАЦОЎНАГА ПРАЦЭСА, ЛЕПШАГА СКАРЫСТАННЯ ЎСЕЙ ТЭХНІЧНАЙ МАГУТНАСЦІ АБСТАЛЯВАННЯ, УКАРАНЕННЯ ЗААХВОЧВАЮЧЫХ ФОРМ АПЛАТЫ ПРАЦЫ І, НАРЭШЦЕ, МАКСІМАЛЬНАГА ПАВЫШЭННЯ ПРАДУКЦЫЙНАСЦІ ПРАЦЫ.

Ці здолелі мы скарыстаць усе чаяўныя магчымасці, каб сапраўды зрабіць крэпкі, рашучы пералом у справе па вышэнні прадукцыйнасці працы?

Безумоўна, не. Фабрычна-заводскія арганізацыі раду прадпрыемстваў не забяспечылі ажыццяўлення пастановы партыі. Аб гэтым красамоўна сведчаць масавыя фатаграфіі рабочага дня, праведзеныя на нашых прадпрыемствах. Фатаграфіі паказваюць, што карысная праца ля варштата складае 50-60 проц., а ў асобных выпадках і менш.

Вось, напрыклад, на Гомсельмашы карысная праца ў агульным па ўсяму заводу складае 66 проц., падрыхтоўка рабочага месца—5 проц., арганізацыйныя непаладкі—11 проц., гутаркі—[illegible] проц. і г. д.

Што каштуе пролетарскай дзяржаве такое разбазэванне рабочага часу? На адным толькі Гомсельмашы штомесячна траціцца «на вецер» 30.000 чалавека-дзён. У перавозе на рэчы гэта кажа-не 840 сіласарэзак недадае Гомсельмаш з-за дрэнна арганізаванай працы. Не лепшая справа і на іншых прадпрыемствах.

Адкуль з галоўнейшых прычын такіх вялізарных страт з'яўляецца дрэнна пастаўленае тэхнічнае нармаванне.

Гэты важнейшы ўчастак яшчэ не з'явіўся непасрэдным об'ектам работы інжынерна-тэхнічнага персанала.

Яшчэ не выкаранены аджыўшыя, даўно асуджаныя партыяй адносіны з боку заводскай адміністрацыі да тэхнічнага нармавання.

Яшчэ і зараз маюць месца такія разважанні, што справа інжынера адказваць за тэхнічнае становішча прадпрыемства, а дырэктар нясе адказвае за тэхнічнае нармаванне. Кіраўнікі-ж прадпрыемстваў у сваю чаргу звальваюць пытанні тэхнічнага нармавання на плечы прафсаюзных арганізацый. Такім чынам тэхнічнае нармаванне знаходзіцца ў бязрытуальным стане.

Чаго варты такі адказ старшага майстра завода «ЧЫРВОНЫ МЕТАЛІСТ» ГАЛІХА. На патрабаванне, каб ён даў нарад на дзённую норму работы, ён адказаў: «ідзі, працуй, а нарад потым будзе». Гэта ў той час, як у гэтым цэху ёсць два нармоўшчыкі, якія займаюцца чым хочаце, толькі не тэхнічным нармаваннем.

Зусім зразумела, што такія пагардлівыя адносіны да тэхнічнага нармавання не павінны мець месца на соцыялістычным прадпрыемстве.

Савецкі інжынер, тэхнік не мае права разглядаць сябе як звычайнага кансультанта па тэхніцы.

Пара, даўно пара ўжо сапраўды павярнуцца адміністрацыйна-тэхнічнаму персаналу тварам да тэхнічнага нармавання.

Было-б грубейшай памылкай думаць, што задача тэхнічнага нармавання абмяжоўваецца толькі ўстанаўленнем норм выпрацоўкі.

ПРАЦАВАЦЬ ПА-НОВАМУ, ЗНАЧЫЦЬ, ТАК АРГАНІЗАВАЦЬ ТЭХНІКА-НАРМОВАЧНУЮ РАБОТУ, КАБ ПЫТАННЕ ЎСТАНАЎЛЕННЯ НОРМ І ІХ РЭАЛІЗАЦЫЯ ПРАДСТАЎЛЯЛІ СА БОЙ АДНО ЦЭЛАЕ. ТОЛЬКІ Ў ТАКІМ ВЫПАДКУ ТЭХНІЧНА ЎГРУНТАВАНАЯ НОРМА МОЖА БЫЦЬ НОРМАЙ ДЛЯ ВЫТВОРЧАСЦІ, НОРМАЙ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ.

Устанаўляючы норму выпрацоўкі, ТНБ павінна ўказаць і шляхі выканання гэтай нормы. А ў нас нават і самі нормы не даводзяцца да рабочага. Рабочы-токар ВЛАДЗІМІРОВІЧ (завод «Чырвоны металіст») працаваў на працягу цэлага тыдня без нормы, не ведаў колькасці патрэбнага часу для выраба яго дэталяй і расцэнкі на іх.

Правільная сістэма вытворчага інструктажа гэта не толькі сродак укаранення ў вытворчасць высокіх тэхніч на-ўгрунтаваных норм, але і метад рацыянальнай арганізацыі працы і самой вытворчасці на соцыялістычным прадпрыемстве.

Як-жа ў нас стаіць справа ў гэтым напрамку? Мы не ўмацоўваем пасады інструктароў кваліфікаванымі, тэхніка-пісьменнымі, добрымі знаўцамі вытворчасці. Вось на заводзе імя Варашылава ў такарным цэху інструктары ПАГОЦКІ, ДРАГУН не дрэнныя рабочыя, але тэхнічна малапісьменныя і таму не забяспечваюць належнага твор чага інструктажа. У выніку—нормы па ўсім заводзе выконваюцца на 25-30 проц. Аналагічнае становішча і па раду іншых прадпрыемстваў. Адсюль задача—ЗАБЯСПЕЧЫЦЬ ПАСАДЫ ТЭХНІЧНЫХ ІНСТРУКТАРОЎ КВАЛІФІКАВАНЫМІ СПЕЦЫЯЛІСТАМІ, УВЕСЦІ ДЛЯ ІХ АБАВЯЗКОВАЕ ПАВЫШЭННЕ ТЭХВЕДАЎ, УЗНЯЦЬ НА ВЫШЭЙШУЮ СТУПЕНЬ ТЭХВУЧОБУ СЯРОД УСЯГО РАБОЧАГА КАЛЕКТЫВА.

Тэхнічнае нармаванне мае вялізарнае значэнне і для правільнай аплаты працы рабочага. Ва многіх выпадках на нашых прадпрыемствах рабочыя ставяцца на пасобныя вытворчыя звенні не адпаведна сваёй кваліфікацыі. На тым-жа заводзе імя Варашылава патрэбна было аплаціць за зборку торфамашын брыгадзе ЛАНЕЎСКАГА звыш 1.000 руб. толькі таму, што былі пастаўлены рабочыя выключна высокіх разрадаў.

Вельмі часта бывае наадварот. На складаныя аперацыі ставяцца рабочыя нізкай кваліфікацыі. У выніку—нормы не выконваюцца і павялічваецца брак прадукцыі.

Было-б зусім няправільна думаць, што адным фактам пераходу на здэльшчыну можна пікідаваць ураўнілаўку. Здэльшчына толькі тады забяспечыць правільныя прынцыпы працы, калі яна будзе грунтавацца на належным тэхнічным нармаванні. Іменна адсутнасцю тэхнічнага нармавання можна вытлумачыць той факт, што масавае ўкаранение «прагрэсіўкі» ў другой палове 1931 года прывяло не да пікідацыі ўраўнілаўкі, а да яе дапейшага паглыблення.

Чым шырэй разгортваецца соцспаборніцтва і ўдарніцтва, тым вышэй узнімаецца вытворчая ініцыятыва ўдарнікаў у справе палепшэння арганізацыі рабочага месца, удасканалення рэжыма работы. Усё гэта ўзнімае на яшчэ вышэйшую ступень тэхнічнае нармаванне. У сваю чаргу апіраючыся на спаборнічаючага ўдарніка, тэхнічнае нармаванне ёсць магутны вагар, які накіроўвае творчы ўздым рабочых на ўзняцце прадукцыйнасці працы і палепшэнне якасці прадукцыі.

Пастанова цэнтральнай камісіі па соцыялістычнаму спаборніцтву з Заходняй вобласцю

Улічваючы, што, не гледзячы на папярэджанні, Дрысенскі раён за апошнюю пяцідзённку адстаў у выкананні плана загатовак ільнанасення і ільнавалакна, цэнтральная камісія па соцыялістычнаму спаборніцтву з Заходняй вобласцю пастанавіла:

Па групе ільнаводчых раёнаў пераходны чырвоны сцяг ЦК і СНК ад ДРЫСЕНСКАГА раёна адабраць і перадаць СЕННЕНСКАМУ раёну. Разам з тым камісія папярэдзіла, што Сенненскі раён павінен падцягнуцца ў галіне здачы ільнасцяны, уздыма зяблівы і сіласавання. У Сенненшчыны аспрэчваюць сцяг Полацкі і Дрысенскі раёны.

Па групе збожжавых раёнаў пакінуць пераходны чырвоны сцяг ЦК і СНК за АРШАНШЧЫНАЙ, папярэдзіўшы, што тэмпы збожжапаставак за апошнюю пяцідзённку па раёну знізіліся. Сур'ёзна аспрэчваюць сцяг у Аршаншчыны Ветрынскі, Рагачоўскі і Касцюковіцкі раёны.

Пераходны сцяг ЦВК БССР пакінут за Барысаўскім раёнам.

Кандыдаты на чырвоную дошку

Цэнтральная камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю пастанавіла вынесці кандыдатамі на чырвоную дошку БССР КАМАРЫНСКІ (сакратар РК тав. ЭЛЬМАН) і БАРЫСАЎСКІ (сакратар РК ЧАРНЫШОЎ, старшыня РВК БАРАНЧЫК) раёны.

Кандыдаты на чорную дошку

Цэнтральная камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю пастанавіла вынесці кандыдатамі на чорную дошку:

ЛЁЗНЕНСКІ, СУРАЖСКІ, СІРОЦІНСКІ, МСЦІСЛАЎСКІ, ЗАСЛАЎСКІ І ДУБРОЎЕНСКІ РАЁНЫ.

16 КАСТРЫЧНІКА

ПАЧЫНАЕЦЦА ЧЫСТКА

ПАРТЫЙНЫХ ЯЧЭЕК ЦЭНТРАЛЬНЫХ ГАЗЕТ: „ЗВЯЗДА", „РАБОЧЫ", „АКЦЯБР", „ОРКА", „КАЛГАСНІК БЕЛАРУСІ", „ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА"

Чыстка будзе праходзіць з 9 гадзін раніцы да 1 гадзіны дня ў памяшканні дома пісьменніка (Совецкая, 68)

Першае пасяджэнне адбудзецца 16 кастрычніка ў 6 гадз. веч.

ПРОСЬБА ДА УСІХ РАБКОРАЎ І РАБОЧЫХ МЕНСКА ПРЫНЯЦЬ АКТЫЎНЫ УДЗЕЛ У ЧЫСТЦЫ

КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ІЛЬНАЭСТАФЕТА

Навесці парадак на прыёмачных пунктах і ільназаводах

УХВАЛІЛІ І ЗАБЫЛІ АБО ІЛЬНЯНАЯ ЭСТАФЕТА ПА-КЛІМАВІЦКУ

КЛІМАВІЧЫ. (Ад нашых спецыяльных карэспандэнтаў).

Клімавіцкі раён не ільнаводчы. Гэтага ўжо даволі для раённых кіраўнікоў, каб не звярачаць ніякай увагі на лён, каб не займацца пытаннямі ільназагатовак.

Між тым раён мае даволі значнае задание па загатоўках тэхнічных куль тур. Паводле плана павінна быць загатоўлена ільнавалакна 2.680 цэнтн., ільнасення—2.100 цэнтн., пянькі — 710 цэнтн., капанель—300 цэнтн., пянькі-саломы—1.100 цэнтн.

Трэба проста сказаць, што Клімавіцкі раён зусім не падрыхтован да прыёмкі ільну. Цяперашняе становішча сур'ёзна пагражае зрывам задання.

Перш за ўсё аб плапах. У сельсоветах іх яшчэ фактычна няма. Да гэтага часу райкантора Загатлён яшчэ не скончыла давядзення планаў да кожнага сельсовета. Загатчык канторы тав. Новікаў тлумачыць гэта тым, што не ўсе сельсоветы прыслалі спісы адпаасобнікаў, уступіўшых у калгасы. У сапраўднасці-ж недаслаўшых вестак толькі 8 сельсоветаў (Дамамятрацкі, Ціманаўскі, Красавіцкі, Аўтухоўскі, Гразівецкі і інш.). А як-жа з астатнімі? Аказваецца, што і тут з «планаваннем» справа далёка не добра. Загатлён даводзіў ім планы, так сказаць, «прыблізныя». Кантрактацыйныя дагаворы, заключаныя вясной, фактычна пашлі на нішто.

Падамо некалькі прыкладаў:

Калгас «Чырвоная змена», Аўтухоўскага сельсовета, закантрактаваў вясной 46 цэнтн. ільнавалакна, 34,6 цэнтн. ільнасення, 20 цэнтн. пянькі і 11 цэнтн. капанель. Якое-ж яму давядзена задание? Калгас павінен здаць 43,5 цэнтн. ільнавалакна, 35 цэнтн. ільнасення, 4,67 цэнтн. капанель.

Такім чынам лічбы здачы зусім не адпавядаюць закантрактаванай колькасці. Яны па сутнасці выпадковыя.

Вось яшчэ другі калгас—«З Інтэрнацыянал», Асмолаўскага сельсовета. Ён закантрактаваў вясной ільну 84,75 цэнтн., ільнасення—65,4 цэнтн., пянькі—30,8 цэнтн. і капанель — 17,18 цэнтн. Здаць-жа ён павінен паводле плана: ільнавалакна — 90 цэнтн., ільнасення—68 цэнтн., пянькі —27,8 цэнтн., капанель—11,3 цэнтн. Такава «якасць» планавання райканторы Загатлёна. Трэба дадаць, што гэта «планаванне» праведзена самім загатчыкам канторы тав. Новікавым. Тав. Новікаў проста «забыў» аб тым, што кантрактацыйны дагавор з'яўляецца дакументам, абавязковым для абодвух бакоў, падпісаўшых яго, што гэты дагавор з'яўляецца ўзаемным абавязацельствам і нікому не дазволена беспадстаўна парушаць яго.

Цікер аб гатоўнасці складаў да прыёмкі ільну. Прыёмпчыкі вельмі задаволены і хваляцца: «У нас няма чэргі».

Чэргі сапраўды няма, але няма і здатчыкаў, няма і прыёмкі, няма валакна. На 10 кастрычніка паступіла ўсяго... 1,1 цэнтн. ільнавалакна. Між тым да гэтага часу павінна было быць загатоўлена не менш 20 проц. гадавога плана.

Зусім нездавальняюча паступае і ільнасення. Да 1-га кастрычніка трэба было загатовіць 850 цэнтнераў, прайшла ўжо першая дэкада кастрычніка, а загатоўлена ўсяго 483 цэнтн. Самае горшае, што раённыя арганізацыі не прымаюць ніякіх мер для фарсавання тэмпаў ільназагатовак.

Прыёмачны пункт, куды здаецца ільнасення, можа змясціць не больш 100 тон, а патрэбна месца для 210 тон. Вось чаму прыёмпчык «задаволен», што ільнасення паступае няшмога.

Няма месца і для трымання збожжа, якое паступае ў Загатлён для пераміванны ільназдатчыкаў. Гэта збожжа ўжо прыбыла, але яно ляжыць на чыгунцы і не выкупляецца Загатлёнам па двух прычынах: па-першае, з-за адсутнасці месца, куды ссыпаць, па-другое, з-за адсутнасці грошай.

Райком і райвыканком да 1-га кастрычніка пагоул не займаліся ільназагатоўкамі, ні разу не абмяркоўвалі гэтага пытання на сваіх пасяджэннях. Пасля першага кастрычніка райком усё-ж вынес пастанову аб уключэнні ў ільназстафету. Але гэта пастанова пакуль што існуе толькі на паперы, а на практыцы не ажыццяўляецца. На месцах няма ніякай масавай работы вакол ільназагатовак. Гэту кампанію ў сельсоветах і парт'ячэйках лічаць другарадная.

Асабліва адсталым участкам з'яўляецца адпаасобны сектар, які ігнаруецца раённым кіраўніцтвам і сельсоветамі ў ільназагатоўках, таксама як і ва ўсіх іншых сельска-гаспадарчых кампаніях.

С. ГАЛКІН, З. ПАСМАНІК.

БЕСПРЫТУЛЬНЫ ІЛЬНАЗАВОД

Чавускі ільназавод № 39 уступіў у эксплаатацыю ў 1932 годзе.

У гэтым сезоне завод павінен пераапрацаваць 1.600 тон трасты новага ўраджаю.

Тыя ўмовы, у якіх апынуўся завод зараз, ставяць выкананне намечанага плана пад лютую пагрозу.

Людзі, якія кіравалі заводам (Новікаў), або не бачылі, што робіцца ў іх пад носам, або самі прымалі ўдзел у шкодніцтве.

Ільнаканапляводбуд, які будаваў завод, не давёў справу да канца. Па яго віне не закончан і не здан у эксплаатацыю 46-сілавы лакамабіль, турбіна і каларыфер.

Лакамабіль на 32 сілы не задавальняе патрэб усяго завода. Калі працуе кудзельны цэх, стаіць турбінны або наадварот. Гэта не дае магчымасці наладзіць нармальную работу машын і зрывае выкананне праграмы кожнага цэха.

Непакрыт поўнасцю дах завода. Праз страху цячэ вада на машыны, яны іржавеюць, расклейваюцца гумавыя пасы. Усё гэта выклікае вялікія прастоі. З-за рамонта лакамабіля завод прастаяў з 1-га па 12 верасня. З 12 верасня па 1 кастрычніка прастоі лакамабіля заялі 11 поўных змен, не лічачы штодзённых прастояў па 1—2 гадзіны.

За верасень прамфінплан па кудзелі выкананы на 64,2 проц., па турбінай трасце на 22,9 проц., па валакну — на 30,4 проц., па турбінных адыходах на 22,8 проц.

У цэхах зусім няма вентыляцыі. У вокнах няма ні адной шыбы, гуляе скразняк, на машынах няма агароджаў.

Усё гэта прывяло да таго, што цякучасць рабочай сілы за апошні час складае на заводзе 40—50 проц. Асноўных кадравых рабочых на заводзе працуе толькі 45 чалавек замест патрэбных 140.

Дагаворы на набор калектыўнай рабочай сілы з калгасамі не заключаны. Большасць рабочых на заводзе — адпаасобнікі. Набор рабочай сілы праходзіць самацёкам, хто ўздумаў, каго і прымаюць на работу.

Гэта дало магчымасць пралезці на завод класава-чужым элементам, якія праводзяць сваю шкодную работу. Да апошняга часу на заводзе працаваў індывідуальна - абкладзены Пехцялёў. Яшчэ і зараз сацыяльнае паходжанне не кожнага рабочага высветлена.

Цікавасці рабсілы спрыяе і тое, што пры заводзе няма інтэрната і дрэнна пастаўлена справа з забеспячэннем.

Пажарная дружына існуе на паперы. Пажарныя прылады параскіданы па ўсёй тэрыторыі завода. У пажарных бочках няма вады, помпы сталь занесены пылам. У пажарным будынку дырэкцыя прыладзілася малаліць грэчку.

З-за адсутнасці пажарнай аховы ў жніўні на заводзе адбыўся пажар, згарэла 43 тоны трасты.

Вакол завода няма агарожы, платы паразбіраны вакольнымі сялянамі на дровы. Прадукцыя раскрадваецца. І не дзіва, бо на ўсёй тэрыторыі — адзін 70-гадовы вартаўнік, які ўвесь час спіць непрабудным сном.

На завод пачала паступаць новая траста, прынята ўжо 15 тон, далейшая прыёмка можа спыніцца з-за адсутнасці памяшкання. На сённяшні дзень на заводзе ёсць адна шаха, якая ўмяшчае 400 тон. Рэшта памяшкання занята трастой мінулага года. Захаванне леташняй трасты недапушчальна-дрэннае. Траста вальгеюць раскіданай і значная частка папсавалася.

Склады для валакна загружаны прадукцыяй Загатлёна, больш 10 тон ляжыць каля двух месяцаў. Не забяспечан завод і апаламі, з-за адсутнасці яго таксама бываюць прастоі.

Завод павінен працаваць на 3 змены са штатам рабочых у 140 чал., але на сённяшні дзень на заводзе працуе адзін кудзельны цэх з 70 чалавек рабочых.

У галіне культурнага абслугоўвання на заводзе таксама нічога не зроблена. Ні клуба, ні лепкутка, дзе-б можна было рабочаму правесці культурна адпачынак, на заводзе няма. Нават насценгазета не выходзіць.

На сённяшні дзень невядома, колькі на заводзе членаў трафсаюза, бо ні прафпаўпаважанага, ні прафкома на заводзе няма. Як у цэхах завода, таксама і ў сталовай пануе антысанітарыя. У сталовай няма сталоў, табурэтак і лыжак. Атрымаўшы абед, рабочы ідзе есці яго на двор.

Можа ў раёне не ведаюць пра становішча ільназавода № 39? Не, аб гэтым ведаюць усе. Старшыня РВК Адамчук ездзіць часта на завод, але бывае там толькі госцем.

Ведае добра аб становішчы завода і Белільнатрактарацэнтр. Па яго камандыроўках не адна камісія прыяжджала абследаваць завод, але далей складання актаў справа не рушылася. Завод, як знаходзіўся ў непрыгледжаным стане, так і застаўся.

ЦКК-РСІ павінна сказаць свае слова аб заводзе № 39 і яго гаспадарах.

П.

Дзень ураджаю і калектывізацыі па БССР

НОВЫ КАЛГАСНЫ ПРЫЛІЎ

ОРША. (На тэлефону ад нашага карэспандэнта).

Дзень ураджаю і калектывізацыі па Аршанскаму раёну быў адзначан поўным выкананнем абавязкаў перад дзяржавай шмат якімі калгасамі раёна. Калгасы зоны МТС поўнасцю завяршылі план паставак збожжа і бульбы.

У радзе сельсоветаў ёсць прыліў у калгасы. У калгас «Вольная праца», Пазіоўскага сельсовета, 16 аднаасобнікаў падалі заявы аб уступленні ў калгас.

Перадавыя калгасы раёна ў дзень калектывізацыі распачалі размеркаванне прыбыткаў. У калгасе «Чырвоны шлях» на адзін працадзень прыходзіцца 8 кіло збожжавых.

14 кастрычніка ў Оршы была праведзена жывёлагадоўчая выстаўка. Лепшыя паказальнікі былі па конегадоўчаму аддзелу, на якім было прадстаўлена 117 экспанатаў, большасць з іх — маладняк арлоўскай пароды.

Выстаўка наглядна паказала, як саўгасы Мокава, Высокае, Бабінічы дапамагаюць суседнім калгасам у развядзенні пародзістых коней. Калгас «Пролетарый» прывёў на выстаўку вытвадак маладняка арлоўскай пароды, добра дагледжанага конюхам Грысанавым.

На выстаўцы была праведзена бегавая трэніроўка. Лепшы паказальнік — у 2 мінуты 41 секунду на 600 метраў— паказаў «Нырок» з калгаса «Большэвік».

Не дрэнна быў арганізаван аддзел буйнай рагатай жывёлы, на якім было прадстаўлена 69 экспанатаў. Добрыя паказальнікі па арганізацыі жывёлагадоўлі паказалі калгасы Ледніцкага сельсовета «Чырвоны рассвет», «Першы май» і «Ляснай паляна».

Слаба прадстаўлен аддзел свінагадоўлі.

КІПЕР.

Калгасы Аршанскай МТС выканалі план збожжапаставак

На аснове большэвіцкай мабілізацыі мас калгаснікаў, у барацьбе за ажыццяўленне лозунга правадыра нашай партыі тав. Сталіна «зрабіць калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў заможнымі» — калгасы Аршанскай МТС поўнасцю выканалі свае абавязкі перад дзяржавай.

План збожжапаставак на 14 кастрычніка выкананы на 100 проц.

Прымаем усе меры да поўнага выканання ў бліжэйшыя дні плана зяблівы, сіласавання і натураплаты.

Дырэктар МТС СЕБЕСЕВІЧ.

Начальнік Палітаддзела МТС РАЗУМАЎ.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ЦКК і „ЗВЯЗДЫ"

ЗАСТАЛОСЯ 10 РАШАЮЧЫХ ДЗЁН

ПАРТЫЯ ПАТРАБУЕ АД ЧЫГУНКІ І ЗАГАТОЎШЧЫКАЎ САПРАЎДЫ БАЯВОЙ, УДАРНАЙ РАБОТЫ

Вывезці ўсю бульбу з перавалачных прыстаняй, разгрузіць станцыйныя пункты

ХОД АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ

(На 15 кастрычніка, у тонах)

Назва арганізацыі	План	Адгружана: За дзень	Адгружана: Ад пачатка кампаніі	Процант
Белкаапгародніна . . .	157.270	2336	109338	69,5
Белплодагародніна . .	113.000	809	71155	63,0
РАЗАМ:	270,270	3145	180493	66,8

15 РАЁНАЎ ВЫКАНАЛІ ЗАДАННЕ

НАСТУПНЫЯ РАЁНЫ ПА-ЎДАРНАМУ ВЫКАНАЛІ ПЛАН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ДА ТЭРМІНА:

ТУРАЎСКІ РАЁН—156,4 ПРОЦ., ВЫЦЕБСКІ—111,2 ПРОЦ., АРШАНСКІ — 109,9 ПРОЦ., АСВЕЙСКІ — 106,7 ПРОЦ., ЧЭРВЕНЬСКІ — 105,8 ПРОЦ., БЕШАНКОВІЦКІ — 105,2 ПРОЦ., ТАЛАЧЫНСКІ — 105,0, ДЗЯРЖЫНСКІ—102,7 ПРОЦ., УЗДЗЕНСКІ — 102,6 ПРОЦ., ЖЛОБІНСКІ—104,8 ПРОЦ., МЕНСКІ—104,2 ПРОЦ., ПОЛАЦКІ—102,1 ПРОЦ., ЧЭРЫКАЎСКІ—100 ПРОЦ., СЕННЕНСКІ—100 ПРОЦ., ВЕТКАЎСКІ — 100 ПРОЦ.

КАЛІ-Б ВАГОНЫ ГРУЗІЛІСЯ САМІ..?

БАБРУЙСК. Пост РЕК-РСІ і «лёгкай кавалерыі» паведамляе:

— Плацёўна станцыя Бярозіна падала прыёмачным пунктам райзага 38 вагонаў для пагрузкі бульбы. Не гледзячы на тое, што вагоны павінны былі грузіцца не больш чым 2-3 гадзіны, яны прастаялі каля 10-ці гадзін толькі таму, што райзаг і чыгунка не пакланаціліся аб рабочай сіле. Не хапала грузчыкаў.

На прыёмачны пункт райзага прывёз ночку бульбу аднаасобнік Міхась Календа, з Камянскага сельсовета. Здатчык даставіў зусім выдабраяк-ную прадукцыю і думаў, што ночку яму ўдасца апукаць прыёмшчыкаў. Пост РСІ выкрыў спробу гэтага кулацкага агента, і ён прымушан быў адвезці бульбу назад.

Быў выпадак, калі прыёмшчык Гурэвіч (Клічаўскі райзаг) грузіў у вагоны мокрую, пялую бульбу. Пост РСІ своячасова рэагаваў на гэта. Бульба была выгружана, вагон загрузілі сухой добраякаснай прадукцыяй.

На 19-м шляху (аддаленне базы райзага) скідалася больш 20 вагонаў бульбы. Вышыня пласта — 3-4 метры. Бульба ляжыць доўгі час і можа папсавацца. Меры з боку загатоўчых арганізацый не прынятыя.

Пост РСІ і «лёгкай кавалерыі» ПАРАЖНЕВІЧ, ЦЫРКІН.

ПРЭМІІ—ПЕРАДАВІКАМ

14-га кастрычніка адбылося пасяджэнне штаба па прэміраванню перадавікоў адгрузкі бульбы пры кіраўніцтве Ўпаўнамзаг СНК.

Штаб пастанавіў прысудзіць першую прэмію па першай групе раёнаў у суме 8.000 руб. АРШАНСКАМУ РАЁНУ, які з поспехам выканаў план адгрузкі ў 9.100 тон і добра вядзе пастаўкі бульбы.

Некалькі Аршаншчыка дрэнна загатаўляе і адгружае гародніну, канчатковае вырашэнне пытання адкладваецца на 5 дзён. Аршанскі раён за гэты час павінен дабіцца завяршэння адгрузкі гародніны Ленінграду. Аспрэчвае прэмію ў Аршанскага раёна БЫХАЎСКІ РАЁН.

Залічаны кандыдатамі на першую прэмію па другой групе раёнаў у суме 6.000 руб. ЖЛОБІНСКІ і ПОЛАЦКІ раёны, якія выканалі план адгрузкі бульбы Ленінграду, але адстаюць у адгрузцы гародніны. Перавагу на атрыманне прэміі мае ЖЛОБІНСКІ раён.

Кандыдатамі на другую прэмію па другой групе раёнаў у суме 4.000 руб. залічаны ГАРАДОЦКІ і БАРЫСАЎСКІ раёны, якія скончылі адгрузку бульбы Ленінграду, але адстаюць па гародніне. Перавагу на атрыманне прэміі мае БАРЫСАЎСКІ раён.

Прэмію ў суме 2.500 руб. (другая прэмія па чацвертай групе раёнаў) атрымаў Ушацкі раён, які добра скончыў адгрузку і не зніжае тэмпаў загатовак бульбы.

2.000 рублёў атрымаў АСВЕЙСКІ раён, які па-ўдарнаму завяршыў адгрузку і вывез бульбу з глыбінкі.

Кандыдатамі на прэмію залічаны СЕННЕНСКІ і ТАЛАЧЫНСКІ раёны, якія павінны дабіцца пералома ў загатоўках і адгрузцы гародніны.

За сапраўды ўдарную работу па перавозках бульбы прэміравана РАГАЧОЎСКАЯ АЎТАКАЛОНА Белдзяржтранса. Начальнік калоны тав. КРАСНОЎСКІ атрымаў 200 руб.; для прэміравання шофераў-ударнікаў адпушчана 1.000 руб.

Прэзідыум ЦКК—аб ходзе усебеларускага рэйда

Прэзідыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК-РСІ БССР вынесці спецыяльную пастанову аб ходзе ўсебеларускага рэйда ЦКК і «Звязды».

— Рэйд паказвае, — гаворыцца ў пастанове, — што Белкаапгародніна і Белплодагародніна не мабілізаваліся на баявую работу па загатоўках і адгрузцы бульбы і гародніны. План загатовак бульбы па Белкаапгародніне на 10 кастрычніка выкананы на 43 проц., па Белплодагародніне на 45,9 проц. Лоеўскі, Горацкі, Рэчыцкі, Прапойскі і Ўваравіцкі раёны загатовілі бульбу ад 13,7 да 27 проц. задання.

Зусім недапушчальнае становішча з ЗАГАТОЎКАЙ ГАРОДНІНЫ па асноўных раёнах: па Полацкаму — 6,2 проц., па Віцебскаму — 6,6 проц., па Аршанскаму — 7,2 проц., па Магілеўскаму — 8,3 проц. Белкаапгародніна загатовіла толькі 18,9 проц., а Белплодагародніна — 18,4 проц. гадавога плана. Вельмі дрэнна ідзе адгрузка гародніны Ленінграду. 14 раёнаў па сістэме Белплодагародніны за апошнюю пяцідзённку не далі ні аднаго процанта прыросту.

Апарат абодвух загатоўчых арганізацый не мабілізаваны на непасрэдную дапамогу адсталым раёнам. З 46 чалавек апарата ВПГ у раёны паслана толькі 4 чал. Пасылка адносіны Белплодагародніны ўсім РКК аб удзеляйнасці на канторы сістэмы гаворыць аб БЕЗДАПАМОЖНАСЦІ І НЯЎМЕННІ АПЕРАЦЫЙНА КІРАВАЦЬ РАБОТАЙ.

Прэзідыум ЦКК і калегія НК-РСІ прапанавалі Белкаапгародніне (т. ЗЕЛІЧОНКУ) і Белплодагародніне (т. АНІКЕЙЧЫКУ) неадкладна мабілізаваць 25-30 проц. работнікаў апарата для дапамогі адсталым раёнам у арганізацыі загатовак і адгрузкі.

У пастанове адзначана, што загатчык Белплодагародніны тав. АНІКЕЙЧЫК правяў простае ігнараванне рэйда ЦКК і «Звязды», бюракратычна адмовіўся ад брыгады.

Зрыўшчыкі адгрузкі

НАСТУПНЫЯ РАЁНЫ ЗРЫВАЮЦЬ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ, ВЫКАНАЎШЫ МЕНШ 50 ПРОЦ. ЗАДАННЯ.

ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ—11,6 ПРОЦ., БЯРЭЗІНСКІ — 20,1 ПРОЦ., ЛОЕЎСКІ — 26,6 ПРОЦ., УВАРАВІЦКІ — 26,7 ПРОЦ., ГЛУСКІ—27,1 ПРОЦ., ЛАГОЙСКІ—29,8 ПРОЦ., РЭЧЫЦКІ—29,7 ПРОЦ., ХОЙНІЦКІ—30,5 ПРОЦ., ЛЮБАНЬСКІ—34,9 ПРОЦ., ПЕТРЫКОЎСКІ—39,7 ПРОЦ., БЯЛЫНІЦКІ—45,6 П

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА

З БОЛЬШЭВІЦКАЙ РАШУЧАСЦЮ БЯЗЛІТАСНА ВЫКАРЧОУВАЦЬ ДВУРУШНІЦТВА, ГРУПАЎШЧЫНУ, КАР'ЕРЫЗМ, МЕСНІЦТВА І САНОЎНА-ПАНСКІЯ АДНОСІНЫ ДА ДАРУЧАНАЙ ПАРТЫЙНАЙ СПРАВЫ

Плады пасіўнага назірання і фармальна-бюракратычнага кіраўніцтва

(На чыстцы наркома лёгкай прамысловасці тав. ГРЫСЕВІЧА)

Лёгкая прамысловасць БССР ужо на працягу некалькіх год знаходзіцца ў глыбокім прарыве. Асабліва ганебна працуе яна ў гэтым годзе. Вядома, якая ацэнка была дана яе рабоце ліпеньскім пленумам ЦК і ЦКК КП(б)Б. Пленум прызнаў работу прамысловасці ў першым паўгоддзі зусім незадавальняючай.

Пасля пленума па сутнасці ніякага пералома не было. Поўгадовы план быў выкананы на 84,2 проц., а гадавы на 9 м-цаў—на 63 проц. Тое-ж самае і ў адносінах якасных паказальнікаў. За гадзіне па прадукцыйнасці працы ў параўнанні з мінулым годам за 8 м-цаў выканана на 98,8 проц., а фонд заработнай платы выдаткован на 105,4 проц. Сабекошт прадукцыі замест зніжэння на 4,2 проц. павысіўся на 4,5 проц.

Даючы ацэнку рабоце прамысловасці, ліпеньскі пленум адначасова ўскрыў і прычыны яе адставання. Пленум адзначаў, што асноўная прычына, прывёўшая прамысловасць да такога глыбокага прарыва,—гэта канцылярска бюракратычныя метады кіраўніцтва вытворчасцю, умацавання і набліжэння кіраўніцтва да нізавых звёнаў. Аднак, Наркамлёгпрам кіраваў і зараз яшчэ кіруе прадпрыемствамі старымі метадамі, без уліку ведання запатрабавання кожнага прадпрыемства ў паасобку. Гэта пацьвярджаецца бесліччу фактаў, якія за апошні час, асабліва пасля ліпеньскага пленума, былі ўскрыты.

Здавалася, што кіраўнік наркамата тав. Грысевіч, праходзячы чыстку, не міне ўсіх гэтых фактаў, а скажа проста і адкрыта аб прычынах прарываў, аб метадах кіраўніцтва прамысловасцю і аб тым, як рэалізуюцца пастановы ліпеньскага пленума ЦК. Аднак, тав. Грысевіч аб гэтым нічога не сказаў. Ён вельмі доўга гаварыў аб росце прамысловасці, аб росце яе тэхнічнай узброенасці, прычым «заслуга ў гэтым,—сказаў ён, — належыць былому ВСНГВ, цяперашняму Наркамлёгпраму і мне, як іх кіраўніку». Усе прарывы прамысловасці тав. Грысевіч прабаваў звесці да «асобных недакладнасцей» кіраўніцтва прадпрыемствамі з боку наркамата. Калі-ж старшыня камісіі т. Хадасевіч папрабаваў сказаць падрабязна, у чым заключаюцца гэтыя «асобныя недакладнасці» кіраўніцтва, то т. Грысевіч адмахнуўся агульнай фразай—«мы мала дапамагалі прадпрыемствам».

Вось якая была «самакрытыка» т. Грысевіча. Замест прызнання памылак—спробы даказаць выправільнасць данай пленумам ацэнкі работы прамысловасці. Тав. Грысевіч нічога не сказаў аб ініцыраванні пастановы пленума апаратам Наркамлёгпрама і аб сваёй уласнай бяздзейнасці. А гэта-ж неабвержны факт, што апарат наркамата не змагаецца за рэалізацыю дырэктыў пленума і што гэта барацьба падменена дэкларацыйнасцю і канцылярска-бюракратычнай шасцёнкай.

Выступаўшы на чыстцы старшыня ЦКК і член рэспубліканскай камісіі па чыстцы т. Лычоў вельмі трапна сказаў:

— Пералома ў рабоце прамысловасці няма таму, што пастанова ліпеньскага пленума наркаматам, на чале з т. Грысевічам, рэалізуецца па-кабінетнаму: навісалі і разаслалі ўсім трэстам і прадпрыемствам загады аб неабходнасці выканання пастановы, і на гэтым справа па сутнасці скончылася. Калі падыйсці да праверкі з фармальнага боку, то як быццам усё ў парадку, а па сутнасці—гэта скрыты сабатаж дырэктыў партыі.

Нарком т. Грысевіч замест рашучай барацьбы з гэтым сабатажам заняў роль пабочнага назіральніка. Нават і назіральнікам ён бывае вельмі рэдкім. Выступаючыя на чыстцы адказныя работнікі наркамата т. т. Кац і Кульбак заявілі, што тав. Грысевіч за працягу цэлага года, асабліва пасля ліпеньскага пленума, зусім не цікавіўся работай апарата, зусім не кіраваў работай прамысловасці. Калі можна гаварыць аб якім-небудзь кіраўніцтве, то яно зводзіцца да выдання за гадаў, праверкай якіх т. Грысевіч ніколі не займаецца. Характэрна, што за ўвесь год пры наркамаце не было праведзена ні адной нарады дырэктароў прадпрыемстваў.

У апараце наркамата панае расхлябанасць, кулуарнае прапоўная дысцыпліна і няма адказнасці за даручаную работу. Сектары, як правіла, не ведаюць, што робіцца на прадпрыемствах, у якім становішчы там працуюць людзі, машыны. Сектар кадраў наркамата да гэтага часу не мае ўліку колькаснага і якаснага складу тэхнічных кадраў на прадпрыемствах, у цэхах, зменах. Наркамлёгпрам—гэта не базавы кіруючы орган.

Сакратар ЦК КП(б)В і старшыня мясцовай гарадской камісіі па чыстцы т. Жэброўскі ў сваім выступленні проста заявіў, што т. Грысевіч, як комуніст-гаспадарнік, не змагаўся па-большэвіцку за выкананне дырэктыў партыі аб прамысловасці, асабліва ў частцы стварэння неабходных умоў для хуткага асваення новых прадпрыемстваў. Тав. Жэброўскі прывёў вельмі яркія прыклады работы віцебскіх прадпрыемстваў. На трыкатажнай фабрыцы імя КІМ у гэтым годзе павінны працаваць 4.000 рабочых, а працуе ўсяго 2.500. Больш на фабрыку ніхто не ідзе, бо жыллёвыя ўмовы не створаны. Пачаты будаўніцтвам квартэры дом. ужо будуецца больш двух год. Тое-ж самае і на шкіпнай фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі». Штодзённа дзесяткі людзей адыходзяць і прыходзяць. Непастаянства складу рабочых не дае магчымасці павышаць кваліфікацыю і асвойваць тэхнічна складанае абсталяванне. А гэта ў канчатковым выніку не можа не адбівацца на якасці выпускаемай прадукцыі.

— Што-ж наркамат прадпрыняў, каб палепшыць жыллёвыя ўмовы рабочых на гэтых прадпрыемствах і гэтым самым ліквідаваць цякучасць? Роўным лікам нічога—сказа т. Шыфрын. Тав. Грысевіч, як кіраўнік наркамата, гэтых пытанняў перад саюзным наркаматам, перад СНК і ЦК КП(б)Б не ўзнімаў, а на патрабаванні прадпрыемстваў аб аказанні дапамогі даваўся алаін і той-жа адказ: «Няма сродкаў, мабілізуйце ўнутраныя рэсурсы».

Замест таго, каб сапраўды ўзважыць і ацаніць усю сур'ёзнасць становішча, наркамат падыходзіў да справы фармальна, наогул. Вось гэта і ёсць саноўна-панскія адносіны да запатрабаванняў нізавых вытворчых звёнаў.

Або ўзяць пытанне стварэння на гэтых прадпрыемствах уласнай механічна-рамонтнай базы. На прычыне слабага асваення рабочымі тэхніча складаных механізмаў, у апошнія часта ламаюцца асобныя дэталі, і машыны робяць вялікія тэхнічныя прастоі. Але гэтыя прастоі яшчэ больш павялічваюцца тым, што рамонт механізмаў і выраб асобных дэталяй выконваюцца вельмі марудна. І толькі таму, што на прадпрыемствах няма добра абсталяваных рамонтных майстэрань. Гэтыя пытанні таксама ставіліся перад наркаматам прадпрыемствамі, прычым ставіліся вельмі сур'ёзна, але дапамогі ніякай не атрымлівалі. Ім таксама раілі «мабілізаваць унутраныя рэсурсы».

Пытанне планавання—адно з вузкіх месц работы Наркамлёгпрама. На гэтым участку таксама панае паўнейшая расхлябанасць і безадказнасць. У сваім выступленні дырэктар ф-кі «Кастрычнік» т. Карасік адзначаў, што шмат фабрыкамі і заводамі складаюцца набегу. Лічбы бярэцца са столі, а трасты і наркаматы іх слепа штампуюць. Але потым у сярэдзіне квартала перасклядаюць, «шарахтуюць» і ўдакладняюць іх. Не ўлічваюцца пры складанні планаў асаблівасці і магчымасці кожнага прадпрыемства ў паасобку.

Вось адзін з узорных такога «планавання». Віцебская шкіпная фабрыка «Прафінтэрн» доўгі час выпускала паўпольты, а магілёўская фабрыка імя Валадарскага—штаны.

Але наркамату чамусці прышло ў галаву памяняць паміж гэтымі фабрыкамі асартыменты, не задумваючыся над тым, што ў сувязі з гэтым прыдзецца ламаць навыкі і кваліфікацыю рабочых. У рэзультаце атрымалася, што на «Прафінтэрне» пачалі выпускаць дрэн на пашытыя штаны, а на фабрыцы імя Валадарскага пікуды ня годныя паўпольты. І зараз наркамат вымушан перарабляць свае галавацяпскія планы.

Усё гэта—плады канцылярска-бюракратычных, канчаткова збанкрутаваных метадаў кіраўніцтва прамысловасцю, плады саноўна-панскіх адносін да запатрабаванняў і патрэб прадпрыемстваў, плады скрытага сабатажа дырэктыў партыі з боку Наркамлёгпрама на чале з яго кіраўніком т. Грысевічам.

Тав. Грысевіч правяраўся на чыстцы не толькі як комуніст-гаспадарнік і кіраўнік наркамата, але і як член бюро ЦК КП(б)Б, які нясе поўную адказнасць перад партыяй не толькі за дрэнную работу прамысловасці, але і за тыя буйныя палітычныя прарывы і недахопы, якія мелі і яшчэ маюць месца ў Беларусі.

Аднак, т. Грысевіч усе гэтыя палітычныя прарывы і недахопы на чыстцы зусім абышоў і гэтым самым змазаў тое, што чыстка праводзіцца партыяй не толькі ў мэтах ачысткі яе радоў ад усіх прымазаўшыхся класавачужых, двурушнікіх і перараджанскіх элементаў, але і ў мэтах ускрыцця і выпраўлення ўсіх памылак, прарываў і недахопаў у рабоце партыйнай арганізацыі.

Зусім недапушчальна, калі т. Грысевіч прабаваў на чыстцы абыйсці такое пытанне, як бяспрынцыпная групоўшчына і месніцтва, маўшыя месца ў КП(б)Б. Ён не толькі не асудзіў гэнага асабістага ўдзела ў групоўшчыне, але ўсімі сіламі імкнуўся ўтаіць удзельнікаў групоўкі і змазаць сваю віну. Гэтым самым тав. Грысевіч, як член бюро ЦК, змазаў значэнне большэвіцкай самакрытыкі. Прычым змазаў ён, аразумела, не па свайму неразуменню, а на той прост тай прычыне, што ён прабаваў адмахнуцца ад сваіх памылак, звесці іх да нуля.

Нават пасля выступлення т. т. Лычо ва і Жэброўскага, якія настойліва патрабавалі шчырасці ў прызнанні памылак, т. Грысевіч у пралаўтаўленым яму праваручнай камісіяй заключным слове таксама нічога аб памылках не сказаў. Ён абмежаваўся агульнай фразай: «Многія ўказвалі правільна, а мно гія былі і неправы». Не прычыне слабага чалавека, які знаходзіцца на вялікай кіруючай рабоце, які з'яўляецца членам бюро ЦК, які дапусціў буйныя палітычныя памылкі. Гэты адказ выклікае вельмі шмат сумненняў у палітычнай выпрымальнасці т. Грысевіча, як комуніста.

Тав. Грысевіч адзін з старых кіруючых работнікаў Беларусі. Але гэта ніколькі не зніжае палітычнай важнасці і вострасці дапушчаных т. Грысевічам памылак і прарываў у яго рабоце. Наадварот, ад яго, як адказнага кіруючага работніка, партыя мае права патрабаваць значна большай адказнасці, значна большай самакрытыкі сваіх памылак, поўнага ўсведамлення іх сутнасці і большэвіцкага іх выпраўлення. Але на ўсім відаць, што т. Грысевіч не хоча ўсвядоміць сваіх памылак, а, значыцца, і выпраўляць іх.

Р. ФРАЛОЎ.

Рэалізаваць прапановы камісіі

(На чыстцы ячэйкі ўсебеларускай канторы Дзяржбанка)

Закончылася чыстка ячэйкі ўсебеларускай канторы Дзяржбанка. У працэсе чысткі выявіўся цэлы рад агідных фактаў скажэння нацыянальнай палітыкі партыі і практыкі банкаўскай работы.

Пытанні банкаўскай работы вырашаліся сямейным парадкам. Малейшыя спробы крытыкі і самакрытыкі заціскаліся. Кіраўнікі банка пакрывалі злодзеяў і растрачыкаў, патуралі класава-варожым элементам. Бюракратызм дайшоў да таго, што кіраўнік банка Фельдман і яго намеснік Шэрман выгналі з сваёй кабінетаў наведальнікаў і нават супрацоўнікаў свайёк-ка ўстановы.

У апараце банка ўсюм адкрыта арудавалі шкодныя элементы. Былы галоўбух канторы Балоцін на вачах у партячэйкі і кіраўніцтва адкрыта даказваў, што «беларуская мова не падыходзіць для работы ў банку». Ён сам не пісаў і не дазваляў пісаць другім супрацоўнікам на беларускай мове, а нападае на ёй тут-жа рэвуе на вачах усіх.

Аб гэтых фактах не раз сігналізавала вышэйшая, але сакратар парт'ячэйкі Мікульскі, мясцком—Крэсін і Мельцэр і кіраўнікі банка Фельдман і Шэрман на гэта не аказвалі належнай увагі. Больш таго, кіраўнік банка Фельдман актыўна выступаў у абарону вялікадзяржаўнага шавініста Балоціна. Ён ні саў спецыяльны ліст у рэдакцыю насценгазеты, у якім прапановаў ёй у далейшым не кампраметаваць адказных работнікаў, і ў прыватнасці, вялікадзяржаўнага шавініста Балоціна.

Не далёка адышоў ад Фельдмана ў гэтым напрамку і намеснік кіраўніка канторы Шэрман. Ён не толькі ня прыняў да ўвагі самую найлепшую атэстацыю пасля таго, як Балоціна ГарКК РСІ зняла з работы.

Парт'ячэйка зусім не займалася пытаннямі арабочання апарата. Маючы ў апараце значную колькасць выключаных, ні парт'ячэйка, ні мясцком не стварылі ім адпаведных умоў для работы, не забяспечылі павышэння іх вытворчай кваліфікацыі. У выніку — многія выключаны зусім кінулі працу ў апараце.

Метады канцылярска-бюракратычнага кіраўніцтва прыймалі да ўвагі раду кредытна-банкаўскіх мерапрыемстваў. Пратэрмінаўкі навык за апошні год замест зніжэння і канчатковай ліквідацыі павялічыліся больш чым у чатыры разы, дасягнуўшы сумы жаля 9 млн. рублёў. Сума неаплочаных рахункаў складае 16,5 мільёнаў рублёў, што сведчыць аб поўным ігнараванні банкам інтарэсаў пакупцоў. План калгасных пасяўваў 3-га квартала выкананы усяго на 33 проц. Дырэктывы партыі па важнейшых пытаннях кредытна-банкаўскай работы ігнаруюцца. Няма кантролю рублём з боку банка.

У выніку прыступлення класавай пільнасці з боку членаў парт'ячэйкі і кіраўніцтва ў кантору банка пралезлі злодзеі, п'яніцы, спекулянты, былыя валютчыкі і тварылі там свае злачынныя справы.

Апошняя шчука злоўжэнняў — Якубайла, Красоўскі, Гельбіцкі, Мурэа-Мураіч і інш. раскрадзілі капітоўнасці і кроны, апусцошылі кліентуру. Так, злодзей і п'яніца Якубайла раскрадзеў на 194 тыс. рублёў розных капітоўнасцей. Валютчык Красоўскі будучы загалчыкам касы кладовай, сістэматычна краў валютныя капітоўнасці, а слепам за ім касіры крадзілі што толькі попадала пад руку.

Кіраўнік банка Фельдман, замест мабілізацыі прамадскасці на барацьбу з гэтымі злачынствамі, абараняў гэтых злачынцаў. Калі ў мінулым годзе Якубайлу прысудзілі да 6 месяцаў прымусовых работ за шядбайныя адносіны да працы, Фельдман і Алейнікаў хадайнічалі перад судом аб яго памілаванні.

Унутрыпартыйная работа ў ячэйцы пастаўлена з рук вон дрэнна. Парт'ячэйка займалася славеснай дэкларацыйнасцю, выносіла прыгожыя пастановы і рэзалюцыі, але не кантрэлявала, не сачыла за іх выкананнем.

Кіраўнік канторы і член бюро ячэйкі Фельдман зусім не прымаў пімкага ўдзела ў рабоце партарганізацыі. Больш таго, ён нават ігнараваў пастановы бюро ячэйкі. А Шэрман, актыўна галасуючы за пастановы бюро, ніколі не правяраў іх у жыцці.

Траба падкрэсліць, што Шэрман з 1904 года быў у Бундзе, а потым перайшоў у партыю меншавікоў і знаходзіўся ў ёй да 1919 года. У гэтай партыі ён быў актыўным работнікам, працаваў у краёвым камітэце. У 1920 годзе Шэрман уступіў у нашу партыю, але ў 1921 годзе быў выключан за тое, што ўтаіў ад партыі свой актыўны ўдзел у меншавіцкім камітэце ў Сібіры пры ўладзе Калчака, якому меншавікі дапамагалі ў барацьбе супроць совецкай улады. У 1925 годзе Шэрман пераклім чынам зноў трапіў у нашу партыю. Калі аналізуеш «звілістасць» Шэрмана ў банку, дык мімаволі ўспамінаюцца словы Леніна, што асаблівасці меншавізма заключаюцца ў адсутнасці «памайстарскую прыстасоўваецца, «прымазваецца» да існуючай сярод рабочых плыні» і «шчэ больш па-майстарску слухаць верай і прадай белагвардзейшчыне, служыць ёй на справе, адракаючыся на словах... Меншавікі, як апартуністы прыстасоўваюцца, так сказаць, «з прынцыпа» да пануючай сярод рабочых плыні, перафарбоўваюцца ў абарончы колер, як заяц станавіцца белым зімой. Гэту асаблівасць меншавікоў трэба ведаць і трэба яе ўлічыць».

Вось якраз гэтай якалічнасці не ўлічыла парт'ячэйка банка. Замест выкрыцця Шэрмана, замест выкрыцця яго меншавіцкай ідэалогіі, значная частка комуністаў апынулася ў палоне гэтай ідэалогіі, падтрымліваючы Шэрмана...

Але чаго не змагла зрабіць ячэйка, зрабіла камісія па чыстцы. Яна выкрыла сапраўдны твар Шэрмана і выключыла яго з радоў партыі.

Заключны сход, на якім былі абвешчаны вынікі камісіі, яшчэ і яшчэ раз з усёй нагляднасцю паказаў, што партыйная ячэйка ўсебеларускай канторы Дзяржбанка і да гэтага часу не ўзялася па-большэвіцку за знішчэнне недахопаў выяўленых у працэсе чысткі.

Больш таго, былі спробы абвяргнуць вывады камісіі. Напрыклад, Фельдман у сваёй прамове імкнуўся даказаць, што вывады камісіі з'яўляюцца зусім няправільнымі, што рад матэрыялаў камісіяй выкарыстан быццам некрытычна, што банкам вялася самая жорсткая барацьба з усімі недахопамі, што ў банку ўсё добра.

Шэрман таксама даказваў, што ўсё ў банку было добра, што ў прыватнасці, у яго рабоце, не было перажыткаў месніцтвам і ён выправільна выключан з партыі.

Па вывадах камісіі апрача Фельдмана і Шэрмана, выступілі ячэйкі мелі мэтай даць рэванш, ні адзін комуніст банка не выступіў. Не выступіў нават і сакратар парт'ячэйкі. Гэта можна ацаніць як змову маўчання. І як вынік гэтага маўчання з боку ячэйкі трэба разглядаць той факт, што сход пакінулі каля 70 проц. беспартыйных супрацоўнікаў апарата.

Ячэйка павінна вынесці належныя ўрокі з чысткі, і, аналізуючы вывады камісіі, ачысціць апарат ад рэшткаў вялікадзяржаўнага шавінізма, меншавізма, ад бюракратаў, чынушнікаў і класава-варожых элементаў, забяспечыць правядзенне ў штодзённай сваёй рабоце генеральнай лініі партыі.

М. Рабцэвіч.

Ход чысткі Менскай партарганізацыі КП(б)Б

У МЕНСКУ НА 15 КАСТРЫЧНІКА ЧЫСТКА АДБЫВАЕЦЦА Ў 20 ЯЧЭЙКАХ. СЯРОД ІХ: ЯЧЭЙКІ НАРКАМАСВЕТЫ (16 КАСТРЫЧНІКА ЧЫСТКУ ПРАХОДЗІЦЬ Б. НАМ. НАРКОМА Т. БЯЛУГА), НАРКАМЗЕМА, БЕЛКААПСАЮЗА, НАРКАМЛЕГПРАМА, ГАЛОЎДАРТРАНСА І ІНШ. З НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ: ВКСГШ, ДЗЯРЖУНІВЕРСІТЭТ БЕЛАРУСІ, БУДАЎНІЧЫ ІНСТЫТУТ.

ЗАКОНЧЫЛАСЯ ЧЫСТКА ГАРКОМА КП(б)Б.

ПАЧАЛАСЯ ЧЫСТКА ЯЧЭЕК БЕЛЖЫЛСАЮЗА, ІНСТЫТУТА ПРАВА, ФІЗКУЛЬТЭХНІКУМА.

ПРАВЕРКА ПАРТЫЙЦАЎ ЗАКОНЧАНА Ў 193 ЯЧЭЙКАХ. УСЯГО ЧЫСТКАЙ АХОПЛЕНА 213 ЯЧЭЕК. ПА МЕНСКАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ ЧЫСТКУ ПРАЙШЛІ НА 15 КАСТРЫЧНІКА 6.920 ЧЛЕНАЎ І КАНДЫДАТАЎ ПАРТЫІ АБО 68,4 ПРОЦ.

МЕНГАРКАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ.

„ГЭОРЫЯ", ЗАПАЗЫЧАНАЯ З АРСЕНАЛА КАНДРАЦЬЕЎШЧЫНЫ

(На чыстцы ячэйкі Наркамзема)

У працэсе чысткі ячэйкі высвятляецца, што асобныя комуністы, пастаўленыя на кіруючыя пасты, не ўлічылі ўрокаў шкодніцкай дзейнасці ў Наркамземе кандрацьеўскіх, эсэраўскіх, нацдэмаўскіх і іншых контрреволюцыйных элементаў. Не зразумелі таго, што разгромленая ў свой час кандрацьеўшчына і прынцыпаўшчына канчаткова не выкарчаваны.

Асвятляючы ход чысткі ячэйкі, мы ўжо адзначалі, што пасля выкрыцця шкодніцкай зграі ў Наркамземе, пры новым кіраўніцтве наркамата і ячэйкі выгнаны з апарата дзесяткі чужых, антысовецкіх элементаў. Але гэта яшчэ не азначае, што адносна класавай пільнасці ў ячэйцы справа стаіць добра, што ўжо ўсё зроблена для таго, каб забяспечыць выраўнанае правядзенне лініі партыі ў рабоце ўсяго апарата Наркамзема па кіраўніцтву сельскай гаспадаркай.

Як вядома, шкоднікі пад маскаю спецыялістаў дэзарганізоўвалі плана ванне важнейшых галін сельскай гаспадаркі, імкнуліся накіраваць развіццё збожжавых культур па патухаючай лініі, арганізоўвалі знішчэнне жывёлы і інш., рабілі ўсё для таго, каб сарваць калгаснае будаўніцтва і апраўдаць тэорыю кандрацьеўшчыны аб тым, што «індывідуальная гаспадарка, з яе зацікаўленасцю, на аснове прыватнай уласнасці, самая ідэальная ў справе развіцця сельскай гаспадаркі».

Гэта тэорыя і справы контр-рэвалюцыйных арганізацый. Але ў справах і разважаннях некаторых работнікаў Наркамзема па планаванні асобных галін сельскай гаспадаркі адчуваецца тое самае.

У праектыўках плана развіцця сельскай гаспадаркі на другую пяцігодку дапушчаны рад буйнейшых палітычных памылак, мяжуючых са ўхілам ...ствам. У процілегласць дырэктывам партыі аб канцэнтрацыі пасева збожжавых культур, паводле праектаванняў Наркамзема ўдзельная вага збожжавых з 65,6 проц. у 1932 г. зніжаецца да 60,5 проц. у 1937 годзе. Азімыя стабілізаваны на ўзроўні 1933 г. Павялічэнне пасева азімай пшаніцы запраектавана за лік зніжэння па сеянца пяцігодкі 40.000 га пасеваў жыта. Плошча пасеваў аўса таксама зніжаецца на 40.000 га за лік пашырэння меншых важных бабовых культур.

Вельмі ў сумных перспектывах прадстаўлена развіццё жывёлагадоўлі. Удзельная вага абагулепага калгаснага стада з 27,6 проц. у 1932 г. павышаецца толькі да 36,3 проц. у 1937 г. Паводле праектаванняў, у 1937 г. стада буйнай рагатай жывёлы будзе складаць толькі 91,6 проц. у адносінах да 1928 года. Пры гэтых абстаўлях бюро па складанні пяцігадовага плана зусім упускае з-пад увагі магчымасць больш фарсаванага роста калгаснага стада. Калі па калгасным сектары праектам плана 70 проц. з прыросту маладняка даводзіцца да ўзросту кароў, то ў адназабочкай і калгаспкай з кожных 100 цёлак даводзіцца да ўзросту кароў толькі 29, а астатніх аддаюць «пад нож».

А чаму-б не арганізаваць закупку калгасамі цёлак у калгасакаў і адназабочкай, чаму-б не арганізаваць часткованга абмена бычкоў па цёлак, каб забяспечыць больш хуткае пашырэнне калгаснага стада.

Магчымасці безумоўна ёсць, але ні намеснік Наркамзема па жывёлагадоўлі Лазоўскі, ні кіраўнік праектыровак па калгасных фермах Грыневіч, ні іншыя члены бюро па складанні плана (Красоўскі, Барноўскі, Балотнікаў) не бачаць ні гэтай магчымасці, ні агульных перспектыў для больш хуткага развіцця жывёлагадоўлі, у сувязі з поспехамі калгаснага будаўніцтва. Кіраўнік бюро па складанні праектыровак пішчэйка. Страле ў апраўданне гэтых памылак імкнецца даказаць, што для больш хуткага развіцця жывёлагадоўлі няма (?!) выстарчальнай кармовай базы.

Дзіўная «тэорыя»! Пры калектывізацыі сельскай гаспадаркі, пры яе вядзенні на аснове даных навукі і тэхнікі, аказваецца, «звужаецца» кармовая база, «змяншаюцца» магчымасці развіцця жывёлагадоўлі ў патрэбным маштабе. Аказваецца, пры ўсіх перавагах калектыўнай гаспадаркі мы ўпіраемся ў тупік кармовай базы і пазбаўляемся магчымасці дасягнуць той колькасці прадукцыйнай жывёлы, якая налічвалася ў рэспубліцы пры індывідуальным вядзенні сельскай гаспадаркі. Ясна, што такія разважанні запазычаны з арсенала кандрацьеўшчыны.

Памылкі ў праекце плана пяцігодкі (па пытаннях збожжавых культур, жывёлагадоўлі, копягадоўлі і аўцагадоўлі) былі выкрыты пасля таго, як гэты праект ужо быў абмеркаван на калегіі Наркамзема. Гэтым пытаннем займалася і бюро ячэйкі. Але выявіўшы сутнасць памылак і асоб, па віне якіх дапушчаны гэтыя памылкі, кіраўніцтва ячэйкі не ўзняло гэтага пытання на прынцыпова-палітычную вышыню, абмежавалася ўказаннем удзельнікам складання плана «на недапушчальнасць праўленага некрытычнага падыхода да прапрацоўкі плана, на адсутнасць патрэбнай большэвіцкай пільнасці».

Нама сумнення, што камісія па чыстцы выявяць памылку бюро ячэйкі і выкрые сапраўдны твар асоб, якія імкнуліся прапхнуць шкодніцкія ўстаноўкі ў планаванне сельскай гаспадаркі.

Я. Іа.

ПАВІЛЬЁН БССР НА ЛЕНІНГРАДСКАЙ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ ВЫСТАЎЦЫ

Ленінградская вобласць за апошнія гэтым аддзеле шмат экспанатаў розных гатункаў бульбы на палях БССР.

Другое месца займаюць тэхнічныя культуры, галоўным чынам лён. Паказана механізацыя працэсаў пераапрацоўкі ільну і дынаміка роста пасеўных плошчаў пад ім. Экспанаваны лепшыя гатункі ільну зышыжняга пасева на палях перадавых ільнаводчых калгасаў і дасладчых станцый.

У аддзеле агарадніцтва і садоўніцтва паказаны дасягненні перадавых гарадніх і садаводных калгасаў БССР, у тым ліку нацыянальнага нітайскага калгаса «МАРКАВІЧЫ», Віцебскага раёна, і калгаса ІМЯ ЧАРВЯКОВА, Мсціслаўскага раёна.

У аддзеле меліярацыі паказаны меліяцыя дасягненні БССР у галіне асушкі і асваення балот. Балотны інстытут, саўгас імя 10-годдзя БССР і комуна БВА выступаюць са сваімі экспанатамі каналаў, капусты, буракоў, махоркі, морквы, вырашчанымі на балотах.

Жывёлагадоўчы аддзел прадстаўлен апісаннямі перадавых жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў БССР, дыяграмамі з дынамікай развіцця жывёлагадоўчых таварных фарм і саўгасаў БССР.

Менскі свінагадоўчы інстытут паказвае вынікі даследаў па захаванні і кармленні маладняка.

Усяго ў павільёне прадстаўлена каля 200 натуральных экспанатаў і 110 дыяграм і фота. Усе экспанаты ўжо адпраўлены ў Ленінград.

Слаўны шлях старога большэвіка

60 ГОД З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ Е. Д. СТАСАВАЙ

ПРЫВІТАННЕ ЦК УсеКП(б) т. СТАСАВАЙ

ЦК УсеКП(б) шле гарачае прывітанне ў дзень шасцідзесяцігоддзя тав. Елене Дзімітрыеўне Стасавай — старому большэвіку, адданейшаму будаўніку нашай партыі, аднаму з актыўнейшых кіраўнікоў міжнароднага комуністычнага руху.

ЦК УсеКП(б).

ПРЫВІТАННЕ ВЫКАНКОМА КОМІНТЭРНА

ДАРАГІ ТАВАРЫШ СТАСАВА!

Прымі наша гарачае таварыскае прывітанне ў дзень 60-годдзя. Мы вітаем ў тваёй асобе стойкага прафесіянальнага рэвалюцыянера, энергічнага працуючага з 1898 года ў радах той партыі, якую Ленін у агні барацьбы супроць царызма і апартунізма ў рабочым руху ператварыў у сталёстую большэвіцкую партыю, якая перамагла ў Кастрычніцкай рэвалюцыі і вядзе пролетарыятам у справе пераможнага будаўніцтва сацыялізма ў СССР.

Мы вітаем прафесіянальнага рэвалюцыянера з багатым баявым вопытам, які актыўна змагаецца ў радах сусветнай партыі большэвікоў, Комуністычнага Інтэрнацыянала з пачатку яго заснавання, непахісна абараняе лепінскай лініі супроць правага і «левага» апартунізма і ў ўсей энергіяй працуючага над ажыццяўленнем вялікай мэты — дабудовы бескласавага грамадства ў Совецкім саюзе і перамогі міжнароднай рэвалюцыі.

Будучы адным з кіраўнікоў МОПР, ты здолела сапраўдзіцца ўдзельніцтвам пыварокіх рабочых мас мобілізаваць у барацьбу супроць фашызма, супроць белага тэрора ў капіталістычных і каланіяльных краінах.

Мы жадаем табе яшчэ многіх год пасляховай барацьбы за справу вызвалення рабочага класа.

КУУСІНЕН, КАТАЯМА, ПЯТНІЦКІ, ГЕККЕРТ, КНОРЫН, БЕЛА КУН, ОКАНО, МАРЦІ, ГАЛЛО, ВАНМІН, БЯЛЕУСКІ, РЭСТ, ВАЙНСТОН.

ЕЛЕНА ДЗІМІТРЫЕУНА СТАСАВА

(Кароткая біяграфічная даведка)

ЕЛЕНА ДЗМІТРЫЕЎНА СТАСАВА нарадзілася ў 1873 годзе ў Пецярбурзе ў сям'і прысяжнага паверанага. Пасля скончання гімназіі была настаўніцай у нядзельнай школе для дарослых работнікаў і падросткаў. У гэты час Елена Дзімітрыеўна знаёмілася з Н. К. Крупскай. У 1897 годзе яна прымала ўдзел у вядомай пецярбургскай забастоўцы

ткачоў. У 1898 годзе ўступіла ў партыю і вядала ўсёй тэхнікай Пецярбургскага камітэта.

З узнікненнем «Искры» тав. Стасава далучылася да яе і сумесна з Н. Апосавым і Радчэнка вяла барацьбу з эканамістамі. У 1904 годзе яна выехала спачатку ў Менск, а потым заграніцу, але ў хуткім часе вярнулася ў Маскву, дзе ёй сумесна з Красікавым, Ленінскам і Баўманам, было даручана арганізаваць і весці работу ў падпольным бюро ЦК РСДРП. Пасля арышту т. т. Баўмана і Ленінска падпольнае бюро ЦК было перанесена ў Ніжні-Ноўгарад, дзе Елену Дзімітрыеўну арыштавалі. Яна сядзела ў таганскай турме і была выпушчана пад заклад, пасля чаго працавала сакратаром Пецярбургскага камітэта РСДРП.

У 1905 годзе Елена Дзімітрыеўна была камандыравана заграніцу на спрэвах ЦК РСДРП і пакідавала пераправу дэлегатаў на з'езд партыі ў Стакгольм і назад. Пасля, у студзені 1906 года, яна вярнулася ў Пецярбург і ў хуткім часе была арыштавана разам з тав. Красікавым і выслана. З восені 1907 па 1910 год яна працавала ў Тыфлісе ў якасці прапагандыста. У канцы 1910 т. прыбыла ўдзел у падрыхтоўцы пражскай канферэнцыі. У 1913 г. была зноў арыштавана і пасля года турэмы адпраўлена ў ссылку ў Енісейскую губерню, адкуль вярнулася ў канцы 1916 года. У Петраградзе яна вяла сярод рабочых прапаганду супроць імперыялістычнай вайны. Апошні раз Елена Дзімітрыеўна была арыштавана царскай паліцыяй уночы в 25 на 26 лютага 1917 г. і вызвалена з турмы 27 лютага паўстаўшымі петраградскімі рабочымі і работніцамі.

З гэтага часу да IX з'езда РКП(б) тав. Стасава працавала сакратаром ЦК. З 1920 года яна працавала ў петраградскім губкоме заг. аргаддзелам. У 1920 года ЦК партыі камандыравае тав. Стасаву ў Баку для работы па арганізацыі з'езда народаў Усхода, дзе яна працавала сакратаром Совета народаў Усхода і адначасова членам кавказкага бюро ЦК.

З 1921 па 1926 год тав. Стасава працавала ў Комінтэрне. З 1926 г.—у ЦК УсеКП(б). У 1927 т. тав. Стасава—намеснік старшыні выканкома МОПР і старшыня ЦК МОПР. З 1930 г.—член парткалегіі ЦКК УсеКП(б).

Такі слаўны і баявы шлях большэвіка рэвалюцыянера. Усё жыццё тав. Стасавай, пачынаючы ад ранняй маладосці, аддана на служэнне пролетарыяту, на будаўніцтва сацыялізма. Ні мінутнага хістання ад ленінскай лініі.

6-га сакавіка 1933 г. у дзень 20-годдзя міжнароднага комуністычнага жаночага дня прэзідыум ЦВК СССР за самаадданую работу ў галіне комуністычнай асветы работніц і сялянак узнагародзіў тав. Стасаву орденам Леніна.

Ад Цэнтральнага камітэта МОПР СССР

Сёння юбілей Елене Дзімітрыеўне споўнілася 60 год. За яе ўлічыма 35 год ударнай рэвалюцыйнай работы як старойшага большэвіка, стойкага ленінца, адпаго з перадавых барацьбітоў за справу міжнародзнай пролетарскай рэвалюцыі.

Пад яе выпрабаваным кіраўніцтвам расла і мацнела ўсесаюзная арганізацыя МОПР. Глыбокая прынцыповасць, большэвіцкая партыйнасць, ленінская цвёрдасць, чулыя адносіны да

Перанесці вопыт работы Горацкай ЦЛДС ва ўсе леспрамгасы

НАКІРАВАЦЬ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧУЮ РАБОТУ НА КАРЫСЦЬ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

АЛ. НОВІКАЎ

Старшыня ЦБ ІТС леса і сплава

Наш абавязак--даць краіне Совецтаў работы высокай якасці

«Звязанае з хуткімі тэмпамі соцыялістычнага будаўніцтва папырэдне патрэбнасці ў тэхнічных кадрах патрабуе выключнага роста ўсіх відаў тэхнічнай грамадзянскі ад рабочых гурткоў на фабрыках і заводах аж да навукова-тэхнічных і навуковых таварыстваў і асадзынный самай высокай кваліфікацыі...».

Так 19 лістапада 1931 г. запісаў ЦК УсеКП(б) у сваёй гістарычнай пастанове аб рэарганізацыі НІТТ і таварыства «Тэхніка масам».

На падставе гэтай пастановы ЦК УсеКП(б) арганізавана навуковае інжынерна-тэхнічнае таварыства (НІТТ) лясной і лесахімічнай прамысловасці. В якімі-ж вынікамі падыходзіць НІТТ да свайго 1-га ўсебеларускага з'езда.

За 1933 г. НІТТ арганізаваў у буйнейшых лясных цэнтрах 4 пастаянныя гурткі па аўладанні марксіцка-ленінскай тэорыяй. Арганізацыя гэтых гурткоў была тым больш неабходнай, што лясны тэарытычны фронт быў апошнія два гады фронтам асабліва жорсткай класавай барацьбы. У выніку не былі разбиты шкодніцкія тэорыі Марозава-Арлова—апалагетаў капіталізма ў лясной гаспадарцы, трацкісцкія выказванні Шульца і рад іншых. Спецыяльная брыгада НІТТ былі праверены інструкцыі па ўліку лесакультурных работ у леспрамгасах (Міран) і падрыхтоўцы лесасечнага фонда па Лесбелу і лясах мясцовага значэння. Брыгада выявіла, што ў гэтых інструкцыях былі ў наяўнасці моманты шкодніцкіх тэорый (застаянасць і бесперапынасць лесакарыстання, адмаўленне канцэнтрацыі лесасек, адвод іх толькі па плошчы, без уліку якасці).

У часе барацьбы і разгрома контрэвалюцыйных тэорый была праведзена велізарная работа па аўладанні новай соцыялістычнай тэорыяй лясной гаспадаркі.

Сярод ІТР леспрамгасаў, прадпрыемстваў і устаноў НІТТ правяло 26 навукова-тэхнічных дакладаў.

НІТТ прааналізавала работу лежневых дарог Беларусі. За тры гады (1931-33 г.) укладзена ў будаўніцтва лежневых дарог 872 тыс. руб. і пабудавана іх 228,5 клм. Гэтыя лежневыя шасейныя дарогі праведзены ў бедных лясных масівах і забяспечваюць асваенне больш 2,5 млн. кубометраў драўніны.

НІТТ ускрыла рад адмоўных моментаў у эксплаатацыі лежневых дарог: дрэнны стан ступняка, невыстарчальную колькасць перасадаў і вусоў, не забяспечанасць ляжнёвак уласным транспартам, адсутнасць належнай колькасці спецыяльных уцяжаных калёс (Чачэрск, Быхаў), падзвычай дрэнны тэхнічны нагляд за ляжнёўкамі (Асіпавічы, Рэчыца). Дан цэлы рад кардынальных тэхнічных указанняў.

Укараненне ў лясную гаспадарку БССР новых хуткарастучых драўнінных парод мае буйнейшае народна-гаспадарчае значэнне. Больш хуткае вырошчванне драўніны дазваляе «абарот» лясоў і ў шмаўкі разоў павялічыць вытворчую здольнасць іх. На канферэнцыі НІТТ па гэтым пытанні прынята пастанова аб увядзенні ў лясах БССР такіх хуткарастучых драўнінных парод, як тополь, мадрына, яса кар, кедравае дрэва, сумах, іргА і іншыя.

Таму ўжо планам другой пяцігодкі на Лесбелу прадугледжваецца масавае культываванне тополя і мадрыны (лісцевніца) на плошчы ў 10 тысяч гектараў.

Сур'ёзную ўвагу НІТТ аддало працы Беларускага навукова-даследчага інстытута лясной гаспадаркі. Арганізаваны НІТТ прыняло рад канкрэтных пастаноў аб сумеснай рабоце з Бел. НІТТ, укараненні ў прамысловасць закончаных работ інстытута, папулярызацыі іх і ўвязцы гаспадарнікаў з працай інстытута.

НІТТ разам з ЗБ ІТС прыняло пастанову аб узяцці шэфства над далейшым правядзеннем і ўкараненнем у вытворчасць работ інстытута: падсочкі клёна і бярозы, механізацыі лесакультурных работ, гідроліза драўніны. Зараз прапрацоўваецца пытанне аб падсочных прамыслах, аналіз якіх разгорнут па ўсіх наказальніках.

Перад сямём з'ездам беларускай арганізацыя НІТТ налічвае 20 ячэек і 410 членаў. Ахоп, бясспрачна, невыстарчальны, асабліва прыняўшы пад увагу тое, што членаў ІТР саюза леса і сплава налічваецца ў БССР 2.150. Але зрух, які вызначыўся ў сувязі з падрыхтоўкай да з'езда, дае магчымасць павялічыць у бліжэйшы час колькасць ячэек і членаў НІТТ прынамсі разы ў два.

БРК саюза і ЦБ ІТС леса і сплава дабіліся ўключэння ў калдагаворы з гаспадарчымі арганізацыямі сродкаў на НІТТ (17.000 руб.), і на ТЗАТ (21.500 руб.). Аднак, рад гаспадарнікаў ігнаруюць работу НІТТ, не ўступаюць у юрыдычныя члены НІТТ (Лесбел, Белкалёсправмаёз, кіраўніцтва ЛМЗ, НКЗВ, лясныя аддзелы МВВ і Заходняй чыгункі), чым падрываюць матэрыяльную базу таварыства.

На мясцах рад работнікаў яшчэ блытаюць задачы НІТТ з задачамі ІТС, тэхпропаў і г. д. і гэта значна тармозіць работу. У пастанове ЦК УсеКП(б) зусім ясна вызначаны функцыі НІТТ: «...Павышэнне кваліфікацыі сваіх членаў, распрацоўка навукова-тэхнічных праблем рэканструкцыі народнай гаспадаркі, пастаноўка і вырашэнне раду новых навукова-даследчых і навукова-тэхнічных задач, апіраючыся на ўвесь адпаведны вопыт як у СССР, так і за мяжой»...,

Але павышэнне кваліфікацыі курсавым ці лекцыйным метадам нас задаволіць не зможа. Ячэйкі НІТТ павінны праводзіць яе на аснове вырашэння вытворчых задач, узнікаючых у прамысловасці, выцякаючых з задач рэканструкцыі народнай гаспадаркі і асваення новай тэхнікі.

Ячэйка НІТТ павінна прапрацоўваць планы развіцця прамысловасці і дамага прадпрыемства, тэхпрамфінплан. Функцыя яе — арганізоўваць вытворча-тэхнічныя суды, займацца пытаннямі рацыяналізацыі, абмена тэхнічным вопытам, налаўліваць кансультацыі і экспертызы і г. д.

Справа НІТТ—высоўваць, ставіць, аб мяркоўваць новыя праблемы. Унутраным зместам работы НІТТ павінен быць дух творчасці, калі кожная навукова-тэхнічная ячэйка не жадае ператварыцца ў бюракратычны зусім непатрэбны арганізм.

Задача мясцовых і раённых бюро інжынерна-тэхнічных секцый, райкомаў прафсаюза леса і сплава, гаспадарнікаў—аказаць максімум садзейнасці і самай пільнай увагі, чаго на сёнешні дзень якраз няма.

Тэхнічная грамадзянскасць краіны Совецтаў мае самыя лепшыя ўмовы для свайго развіцця, створаныя комуністычнай партыяй і совецкай уладай.

Інжынеры, тэхнікі і навуковыя працаўнікі лясной і лесахімічнай прамысловасці могуць даць і дадуць краіне работы высокай якасці і значэння, якіх не мае капіталістычны свет. Толькі пры дыктатуры пролетарыята і соцыялістычным ладзе для развіцця навукі і тэхнікі створаны ўмовы, якіх яны ніколі не мелі і не маглі мець. Перадкастрычніцкая вытворчая пераклічка яшчэ больш узнімае дух нашай творчасці на карысць соцыялістычнага будаўніцтва.

Праф. В. Пераход

Навуку і тэхніку--на службу соцыялізма

Навукова-даследчая работа ў галіне лясной гаспадаркі БССР пачалася звыш 10 год таму назад. Але першапачатковы перыяд арганізацыі не мог даць капітальных вынікаў. Даследчая справа рабілася пры кафедрах, якія вы соўвалі акадэмічныя тэмы, выконваючы іх на працягу некалькіх год (нават да гэтага часу мы яшчэ маем нязкончаныя тэмы).

Што цікавіла даследчую справу ў той час? Галоўным чынам, — пытанні стацыянарных назіранняў, якія наогул мяшаць інтарэс для навуковага работніка, але якія мала цікавы для вытворчасці.

Стварэнне цэнтральнай лясной даследчай станцыі БССР у Горках значна пашырыла работу ў галіне пастаноўкі, але тэмсама мала наблізіла даследчую справу да вытворчасці.

Тэорыя павінна даць практыкам — лесаводам «сілу арыентыроўкі, яснасць перспектывы, упэўненасць у рабоце, веру ў перамогу нашай справы».

З моманта стварэння Беларускага навукова-даследчага інстытута, згодна пастановы СНК ад 1-X—30 г., пачынаецца рашучы паварот лясной даследчай справы тварам да вытворчасці. Тэматычныя планы даследчай работы сталі абгаварвацца ў леспрамгасах (Асіпавічы, Рэчыца, Чачэрск, Гомель), на заводах (Бабруйск, Нова-Белічы). Рабочыя пачынаюць прымаць удзел у абгаварэнні найбольш актуальных пытанняў вытворчасці — у галіне лясной справы і высоўваць вузлавыя праблемы механізацыі, павялічэння прадукцыі і г. д.

БНДІ лясной прамысловасці ў Гомелі за час свайго існавання (1930-1932 г.) вырашыў рад вельмі актуальных для развіцця прамысловасці праблем, як праблема скарыстання сасны для запалкавай прамысловасці, асвятленне каніфолі (для экспарту), скарыстанне адгонных вод для атрымання эсенцыі.

У галіне лясной гаспадаркі Беларускі навукова-даследчы інстытут мае ўжо зараз рад прапрацаваных актуальных тэм: выкананне сырцовай базы (лясы БССР), выгады асартыментаў па асобныхародах (дуб, вольха, асіна), распрацаваны меры догляду за лесам (дубова-грабавыя, дубова-асінавыя і дубова-сасновыя дрэвастаны), вынікі даследвання натуральнага адкаўлення ў барах-верасніках, плодапашчэнне хвойных парод, лясныя культуры, структура леспрамгаса.

Асаблівая ўвага павінна быць звернута на прапрацоўку тэмы па механізацыі пасева лясного насення; гэтая тэма была скончана прадстаўленнем новай дыскавай лясной сеялкі, якая значна палягчае вытворчасць. Праект гэтай сеялкі зараз паслан на зацвярджэнне ў Маскву.

БНДІ лясной гаспадаркі мае ў сваім складзе сектар шасотні хвойных і лісцевых парод, які вядзе вельмі цікавую работу па скарыстанні жыўіцы і дрэўнага сока. БНДІ атрымаў у бягучым годзе жоўтарны алініовы сіроп і алініовы цукар, а з бярозы — спіртус. Асабістае месца займаюць работы па гідролізу драўніны, якія таксама заслугоўваюць увагі вытворчасці і даюць апошнія новыя перспектывы.

Даследчая справа патрабуе ўвагі ўсёй грамадзянскасці. Матэрыялы даследчага інстытута могуць і павінны скарыстоўвацца вытворчасцю. Тут першая роля належыць ячэйкам Навукова-інжынерна-тэхнічнага таварыства.

У другой пяцігодцы «пафас новага будаўніцтва павінен быць дапоўнен пафасам асваення».

Укараніць усе дасягненні навукі і тэхнікі ў вытворчасць, узняць яе на яе вую вышэйшую ступень, у цеснай сувязі з развіццём нашай соцыялістычнай гаспадаркі — такавы задачы НІТТ на данным этапе яго работы.

Аб скліканні гарадской канферэнцыі рабочых-ударнікаў энергетычнай гаспадаркі

Пастанова сакратарыята Менгаркома КП(б)Б ад 14 кастрычніка 1933 г.

1. Прапанову фракцыі гарпрафсавета аб скліканні на 21 кастрычніка г. г. гарадской канферэнцыі ўдарнікаў энергетычнай гаспадаркі зацвердзіць.

2. Прапанаваць парткалектывам і ячэйкам фармаваць масавую работу на падрыхтоўцы да канферэнцыі. На пасяджэннях бюро прапрацаваць пытанне эканоміі электраэнергіі, мацнейшы асвятляльнай сеткі, поўнамацнага скарыстання матораў і эканоміі энергіі.

3. Парткалектывам заводаў «Большэвік», Спіртазавод, імя Молатава, «Пролетарый» і «Беларусь» на працягу чэрвеня дзён вырашыць пытанне аб поўнай і бесперабойнай эксплаатацыі наўчай часткі гэтых прадпрыемстваў электрэўстаноўкі.

4. Прапанаваць начальніку менскага чыгуначнага вузла, начальніку дэпо і дырэктарам заводаў імя Мясніка, «Комунар» і імя Варашылава прыняць удзел у работах канферэнцыі.

5. Прасіць начпалітаддзела раёна (Орша) т. Пірылава забяспечыць удзел на гэтай канферэнцыі адказнага прадстаўніка раёна.

6. Зацвердзіць наступны парадак дня канферэнцыі:

Даклад дырэктара электрастанцыі тав. Сухаручэнка аб падрыхтоўцы электрастанцыі да асенне-зімовага максімума.

7. Ухваляючы прапанову ГОПС аб прапрацоўцы практычных мерапрыемстваў да канферэнцыі вылучанымі секцыямі, прапанаваць фракцыі сканчыць падагульненне матэрыялаў гэтых секцый не пазней 17 кастрычніка г. г.

8. Лічыць неабходным прысутнасць на гэтай канферэнцыі прадстаўнікоў заводскіх арганізацый торфзаводаў, забяспечваючых электрастанцыю апалам, прапанаваўшы ГОПС забяспечыць іх яўку.

9. Абавязаць прысутнічаць на канферэнцыі т. т. Гершоне і Каранеўскага. Правядзенне канферэнцыі даручыць тав. Шулькіну.

Сакратар Менгаркома КП(б)Б
КУДЗЕЛЬКА.

ЗРУХУ УСЕ ЯШЧЭ НЯМА

Палітасветработа па-ранейшаму ігнаруецца

У маі месяцы гэтага года прэзідыум ЦКК праверыў работу культпалітасветустаноў і абслугоўвание імі пасеўчай кампаніі. Прэзідыум тады прызнаў, што ўзмы соцыялістычнай культуры на сушасці не працуюць. Значная частка ДОК знаходзіцца на замку. Такіх да моманта абследавання налічвалася каля 300. Галоўнымі прычынамі гэтага найдзеннага становішча з'яўлялася тое, што НКА і яго выканчы органы, прафсаюзныя арганізацыі працаветы і рад партыйных арганізацый не ацанілі палітычнай важнасці гэтай справы, не ўзначалілі правядзенне гэтай работы. Даўшы такую суровую ацэнку становішча работы палітасветных устаноў, прэзідыум ЦКК катэгарычна папярэдзіў НКА ў асобе былога намесніка нар кома тав. Рудзіцкага, сак. палітасветсек кара т. Паляўцова і прапанаваў на працягу самага кароткага часу наладзіць работу палітасветных устаноў.

Пяць месяцаў прайшло пасля пастановы прэзідыума ЦКК. Зробленая брыгадаю «Звязды» праверка ўстанавіла, што на гэтага часу кіраўніцтва НКА, палітасветны сектар, які ў першую чаргу адказвае за работу палітасветных устаноў, пазбеглі аб палец не ўдарылі для ажыццяўлення гэтай пастановы. Больш таго, матэрыялы гаворяць аб пагоршэнні работы палітасветных устаноў. І не дзіва. У Наркамасветы па сутнасці няма палітасветнага сектара, няма чалавека, які адказвае за гэты участак работы. Нам загадчыка сектара т. Паляўцоў загадзем перавялі кіраўніком сферы самаадукацыі. Палітасветсектар бонце тольки на паперы. У НКА зараз пытаннямі масавай палітыка-выхаваўчай работы ніхто не займаецца. Ведаюць-ж добра аб гэтым парт'ячэйка і сакратар не тав. Улазаў, зносілі-ж яе лікую рэзалюцыю аб неабходнасці перабудовы работы і кіраўніцтва палітасветустановамі. А на практыцы нічога не зроблена для ажыццяўлення гэтых пастаноў.

Прэзідыум ЦКК прапанаваў за лепш час падрыхтаваць і перападрыхтаваць 240 чалавек палітасветчыкаў, укамплектаваць кадрамі ўсе дамы соцкультуры. А падрыхтавалі на двухмесячных курсах толькі 74 чал. На сёнешні дзень па вестках ад 82-х раёнаў не хапае 122-х чалавек. Такім чынам, 122 палітасветустановы закрыты з-за адсутнасці людзей і ніякіх мер не прынята для падрыхтоўкі патрэбнай колькасці палітасветкадраў.

У сувязі з арганізацыяй палітаддзелаў пры МТС і саўгасах патрабуецца перабудова сеткі палітасветных устаноў, увязка іх работы з палітаддзеламі. Праўда, вось пастановы калегіі НКА аб арганізацыі двух культбаз пры Жлобінскай і Клімавіцкай МТС і адпушчэнні сродкі на гэту справу. Але далей выканання пастановы НКА не пайшоў, культбазы не заснаваны, бо няма каму займацца такой «дробяззю». Ніякай сувязі паміж палітасветустановамі і палітаддзеламі няма.

У такім-жа стане знаходзіцца бібліятэкі і кіраўніцтва імі з боку ЦКА. Пастановы бюро ЦК аб бібліятэчнай справе і ігнаруюцца ў БССР абавязкамі НКА у двухдзённы тэрмін перабудзіваць існуючую сетку бібліятэк, заснаваць іх пры палітаддзелах МТС, саўгасах, калгасах, укамплектаваць іх адпаведнай літаратурай, арганізаваць курсы падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі бібліятэкараў з такім разлікам, каб ахапіць на працягу 1933 г. усіх бібработнікаў, арганізаваць пастаянны жывы інструктаж бібліятэк. Оказана ясна, выразна і катэгарычна. І вось тры месяцы лежыць праект пастановы калегіі пад назвай «Мерапрыемствы аб рэалізацыі пастановы ЦК пра бібсправу» не разгледжаны і не зацверджаны. Даручана гэта было тав. Давідовічу— і ні аднаго мерапрыемства на сёнешні дзень не праведзена па рэалізацыі пастановы. А для таго, каб не мазолі вачэй бібліятэчны інспектар, апошняя мабілізавалі і паслалі на два месяцы на раён. Па Наркамасветы раўнадушна і раздзелы нерасветы. Дамы соцкультуры выкрасены з поля іх дзейнасці. Так, па Уваравіцкім раёне з 22 хат-чытальнямі—11 закрытых, аналагічнае становішча і па іншых раёнах. Уваравіцкая райбібліятэка на працягу года не папоўнілася ні адной кнігай. Нават зарплаты бібліятэкар не атрымлівае ўжо 8 месяцаў. У будка-запалёўскай райбібліятэцы разбазарэн увесь кніжны фонд, засталося толькі брашуры, пастарэлыя, лішоку непатрэбныя. А такіх бібліятэк шмат.

У пастановах бюро ЦК і ЦКК запісана тэксама, што «рабочыя клубы не мабілізавалі сваёй работай шырокія масы рабочых на большэвіцкае сканструяванне пэфскай работы». Ці зрабіў што-небудзь культсектар ЦПСПБ для ажыўлення работы клубаў, для ўключэння іх у работу партыі па рэалізацыі важнейшых мерапрыемстваў па вёсцы. Загадчык культсектара ЦПСПБ тав. Рабіновіч занят складаннем клубнай пяцігодкі і адпаведна, і ніякіх мерапрыемстваў па рэалізацыі дырэктыў партыі не праводзіць.

Работай прафсаюзных бібліятэк ніхто не кіруе, і вось результаты: бібліятэка клуба медсанпрацы (Менск) задумала падчысціць свае кніжныя фонды і ма су капітэльных навуковых кніг выкінуць у падвал. І зараз многія навуковыя медработнікі прымушаны з падвала вы цягаць запілы, спарахнелыя кнігі: бібліятэка клуба металістаў (Менск) разам са школьнай літаратурай пакінула творы Леніна, Сталіна. Такіх-ж фак ты мелася ў бібліятэцы клуба працаеўсты, буладзіўкоў. Бібліятэка чыгуначнікаў (Віцебск) выключыла з бібліятэк усіх класікаў літаратуры дарэвалюцыйнага выдання.

Пытаннямі падбора бібкадраў, іх кваліфікацыяй ніхто не займаецца. Клубы бяруць на работу першага, хто толькі дае згоду працаваць бібліятэкарам. Вядома, ёсць і заменчаюць сярод бібработнікаў. Алкуглічае металічнае кіраўніцтва бібліятэкамі. Фабзайкомы па прыкладу ЦПСПБ, зусім мала займаюцца работай бібліятэк.

Сектар кнігагандля (нам. заг. Мяхліс) таксама нічога не зрабіў для ажыццяўлення дырэктывы ЦК КП(б)Б, ні аднаго камплекта кніг не паслаў у маскаўскія бібліятэкі. БДВ і яго сектар кнігагандля не скарысталі ўрокаў ад выкрытых у свой час партыяй яўных контрэволюцыйных вылазак сярод работнікаў кніжных крам (Дрыса, Сураж, Будка-Капалёва, Гомель), не праверылі людзей, працуючых у кніжных крамах, і становішча хавання кніг. 23 верасня інспектар ЦКК выязджаў на базе № 2 БДВ у Менску, што тамы Леніна, Пакроўскага, шмат стабільных падручнікаў ляжалі запылы, або так шапсаваныя, што імі карыстацца нельга. Сетка кнігагандля прадстаўлена самой сабе, без кантролю і кіраўніцтва з боку сектара.

Вялікая роля ў правядзенні масавай культпалітасветнай работы адведзена кіно. Ці пераключыла сваю работу Дзяржкіно (у прыватнасці яго сектар масавай палітасветнай работы) на максімальнае скарыстанне кіно-стацыянараў і перасоўак для абслугоўвання калгасаў і саўгасаў добраякасным апавядальнымі сучасным задачам фільмамі? Палітасветны сектар Дзяржкіно абмежваецца складаннем метражнай формы плана, запоўненага лічбамі, разгледзеў план свайм чы-ам адпаведным і на гэтым супакоіўся, лічачы, што раёны ўжо забяспечаны базовым, аперацыйным, жывым кіраўніцтвам. А тое, што адбываецца на мясцах, гэта іх не датычыцца. У Асвейскім раёне няма ні адной кінапересоўкі. У Вушачах, Дрыса, кіно-перасоўкі не працуюць, у Воўпаковічах за жнівень і верасень месяцы абслужаны тры калгасы, па 13-ці раёнах ні адной кінаустаноўкі не створана, няма ні адной фотакінрыны. Дзесяткі кіно-перасоўак не працуюць з-за адсутнасці кадраў кінамеханікаў, ніхто работы адпаведнага Дзяржкіно і раённых упаўнаважаных не праверыў. Работа ішла і зараз ідзе на старых, асуджаных партыяй метадах, кіруюць «наагул», папярова, бюракратычна, без дыферэнцыявання ўліку асаблівасцяй момента, раёна, прадпрыемства ці калгаса.

Вышэй прыведзеныя факты ясна гаворыць, што дырэктывы бюро ЦК і ЦКК яўна ігнараваліся памяркоўнымі арганізацыямі, ніякіх мер не прынялі для карэнных перабудовы сістэмы, метадаў работы, для разгортвання масавай палітыка-выхаваўчай работы. Вінаватыя ў гэтым ігнараванні павінны быць прыцягнуты да самай суровай адказнасці.

Брыгада «Звязды» ПАЛЯШЧУК, ХУРГІНА, МІЛЬКЕВІЧ.

Конкурс на лепшы ЖАКТ

ВУЧЫЦЦА АД ЖАКТА № 45!

На чале праўлення жакта стаіць энергічны старшыня тав. Рубін. Ён адным з першых уключыўся ў конкурс і адразу-ж разгарнуў актыўную работу сярод сваіх членаў жакта. Ён правільна зразумеў, што без упяўнення ўсёй масы членаў жакта, усяго жактаўскага актыва ён многага не дасягне. Таму ў мабілізацыі жактаўскага актыва па жакту № 45 мы сустракаем рад такіх соцыялістычных метадаў, якія павінны быць перанесены ва ўсе жакты Менска.

Адным з такіх важных мерапрыемстваў з'яўляецца ўстанаўленне пераходнага чырвонага сцяга для лепшага домаўладання на чале з яго ўпаўнаважаным. Атрымаць пераходны сцяг зможа толькі той домаўпаўнаважаны, які дабіўся поўнай ліквідацыі запазычанасці па кватарнай плане, скачання рамонтаў, прыкладнай чыстаты на двары, у кватэрах і прыбіральнях, ахопа не менш 75 проц. хатніх гаспадынь розным гурткам і г. д.

Барацьба за пераходны чырвоны сцяг ускалыхнула не толькі ўпаўнаважаных дамамі, але і ўсіх жыхароў жакта. Пасобныя ўпаўнаважаныя дамамі паказалі прыклад зразумення сваіх абавязкаў. Вось упаўнаважаная дома № 26 па Ракаўскай вуліцы тав. Харун. Сваё ўключэнне ў конкурс яна пацвердзіла разам калкуляцыі абавязкаў і выклікам на соцыялістычнае спаборніцтва домаўпаўнаважаных Бацьніна і Язгура, прычым не абмежвалася самаабвязацельствамі, а выявіла, якія работы трэба правесці па яе домаўладанні і прад'явіла праўленню жакта соцыялістычны рахунак. Яна першая па жакту высунула патрабаванне да праўлення — закончыць дробныя рамонты па яе домаўладанню (4 дамы), афарбаваць дахі, ачысціць прыбіральні, сметнікі і г. д.

З яе ўзяла прыклад домаўпаўнаважаная дамоў № 53 і 55 па Ракаўскай вуліцы тав. Окур і выклікала на соцыялістычнае спаборніцтва ўпаўнаважаных Цырліна і Майзельс.

Соцыялістычнае спаборніцтва ахапіла радавых членаў жакта. Яны больш увагі аддаюць зараз чыстаце і санітарыі. Хапіла гаспадыні прыступілі да ўборкі сваіх кватэр да Кастрычніцкіх свят.

У справу мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў уцягнуты піянеры жакта. Ужо да гэтага часу дзеці жактаўскага актыва сабралі каля 2 скрынак старых цвікоў.

Пры дружнай дапамозе ўсяго жактаўскага актыва і членаў жакта, праўленне зараз закончвае ўсе рамонты і спадзяецца скончыць іх датэрмінова. Адрамантаваны ўсе жалезныя дахі, вапалову скончан рамонт гонтавых дахаў. Праўленне жакта не чакала, пакуль гар жыласаз прыняе для іх гонту. Яно атрымала нарад, наняло аўтамашыну за 100 руб. і прывезла з Чэрвеня 235 коп гонты. Скончан рамонт дома № 14 па Хлебнай вуліцы. Разгорнут рамонт дома № 1-31 па вуліцы Вызвалення. Ачышчаны ўсе двары. Пабелены прыбіральні і смяцёвыя скрыні. Усе тратуары і брамы прыведзены ў парадак. Разгорнут рамонт печаў. Актыўную дапамогу ва ўсёй гэтай рабоце аказвае загадчык дамамі тав. Свірынаўскі, які, уключыўшыся ў конкурс, выклікаў на соцыялістычнае спаборніцтва загадчыка дамамі жакта № 47.

Улічваючы значэнне соцыялістычнай узаемадапамогі, праўленне жакта № 45 зараз арганізуе дапамогу сваёму суседняму жакту.

Асобна трэба спыніцца на той увазе, якую аддае праўленне жакта № 45 свайму дзіцячаму саду. Да 1-га лютага г. г. дзіцячы сад знаходзіўся ў веданні гаржыласаза. Аб гэтым часе работнікі сада ўспамінаюць з жудасцю. У садзе не было святла. Кухня была ўся чорная ад дыма, са столі капяло, вокны замест шыб былі забіты фанерай. З 1-га лютага дзіцячы сад перашоў у веданне жакта № 45. Зараз сад не пазнаць. Чыстае, светлае і цёплае памяшканне. У садзе знаходзіцца 56 дзяцей рабочых і работніц. Арганізаваны для дзяцей рабочыя куткі: сталярны, пашэйны, музычны і выхадзілі. Праўленне набыло піяніна, ложкі. Закуплена шмат вучэбных дапаможнікаў. Педагагічны персанал вядзе інструкцыйную работу сярод матак, вучыць, як выхоўваць дашкольнікаў. Нядаўна ў садзе ўвялі вячэру — дзеці атрымліваюць яду тры разы ў дзень.

Зразумела, у жакце ёсць яшчэ не мала недахопаў. Яшчэ шмат трэба працаваць, каб сапраўды зазяляць пярэдніцтва ў конкурсе на лепшы жакт. Каб дабіцца перамогі, праўленне жакта разам з актывам разгорвае самакрытыку. Выпушчаны насценная фотагазеты. Насценгазета выкрыла домаўпаўнаважанага тав. Окуня, які зрабіў спробу займацца «очковтирательством». На прапанову прадстаўніка спісы ўсіх рамонтаў па свайму дому, тав. Окунь абышоў толькі 8 кватэр замест 20 і прадставіў няпоўны спіс.

Як відаць, праўленне жакта № 45 разам з актывам пусціла ў ход усе вагары, ужывае рад карысных і апрабаваных метадаў соцыялістычнага спаборніцтва — у барацьбе за пярэдніцтва. Гэтыя метады работы павінны стаць здабыткам для ўсіх іншых жактаў, якія, да рэчы, вельмі слаба раскачваюцца.

З 8 жактаў, якія рабілі справаздачы на апошнім пасяджэнні конкурснай камісіі (14 кастрычніка) толькі два жакты № 45 і 41 сапраўды ўключыліся ў конкурс. Іншыя — жакты № № 5, 53, 34, 51, 36 і 9 — або ўключыліся толькі на паперы, або вельмі слаба разгарнулі работу. Наступ, паводле вестак гаржыласаза, з 61 жакта толькі 51 ўключыўся ў конкурс.

Гэта гаворыць аб тым, што барацьба за пярэдніцтва ахапіла толькі незначную частку жактаў. Таму перадача вопыта лепшых, перадавых жактаў з'яўляецца важнейшым мерапрыемствам, якое стаіць перад таржыласазам і пролетарскай грамадзянскасцю. Вялікую ролю павінны адыграць у гэтай справе дапутэты гарсовета, якія, да рэчы, яшчэ не ўключыліся ў падрыхтоўку горада да Кастрычніцкіх свят. Зусім слабы ўдзел прымаюць у конкурсе прафсаюзы, у прыватнасці, ЦП саюза гарадскіх прадпрыемстваў і грунком дворнікаў.

Да канца конкурса засталося толькі 15 дзён. Між тым, работы яшчэ вельмі шмат. На агульным сходзе жактаўскага актыва, які нядаўна адбыўся, дзе прысутнічала 400 чалавек, прадстаўнік «Звязды» арганізаваў «жывую анкету». На пытанне — у каго дымяцца заканцелыя кухні — падняла рукі 17 проц. прысутных, на пытанне — дзе цякуць дахі — адказала 10 проц. прысутных, у каго пратэкі падлогі — 9 проц., каму патрэбна пяло — 19 проц., у каго чэ ў парадку прыбіральні — 8 проц. «Жывая анкета» паказала, што ў значнай частцы жактаў многія кватэры патрабуюць грунтоўнага рамонта і атыстакі. Каб гэтага дабіцца, каб дабіцца сапраўднай падрыхтоўкі рабочых кватэр да Кастрычніцкіх свят, трэба мабілізаваць усе сілы і энергію, трэба мабілізаваць у дапамогу ўсю пралетарскую грамадзянскасць.

Вопыт перадавых жактаў — вось шлях да заваявання пярэдніцтва ў конкурсе на лепшы жакт. П.

АБ КУЛАЦКАЙ СЯДЗІБЕ І РАЁННЫХ ГАСТРАЛЁРАХ

Дзяржынскі раён гаекбна адстае ў асенніх работах.

План па сяўбе жыта выканан на 24,6 проц., па пшаніцы —на 89,9 проц. Па калгасах заданне выканана на 93 проц., саўгасах — 87,7 проц. і аднаасобным сектары — на 64,9 проц.

Шмат фактаў сведчаць аб тым, што не ўсюды аднаасобнікі атрымалі зямлю пад засеў азімых. Аднаасобнікі Дабрынёўскага сельсавета вымушаны чакаць уборкі бульбы для таго, каб потым атрымаць зямлю для сяўбы азімых. У радзе месц аднаасобнікі захапляюць калгасную зямлю для пасева жыта, а запасныя фонды не скарыстоўваюцца. На плошчы калгаса «Камінтэрн» сеюць жыта аднаасобнікі вёскі Лайчыха. На зямлі калгаса «Новы будаўнік» сеюць аднаасобнікі вёскі Мелешава і Падгор'я.

Чахарда ў зямляўпарадкаванні калгасаў і планаванні прыводзіць да таго, што па калгасу «Камінтэрн 2» былі парушаны севазвароты, звыш 40 га жыта пасеяна на жыту. Практыка-ж паказвае, што гэта зніжае ўраджайнасць процантаў на 40.

У мінулым годзе кулацкі зямляўпарадчык Каралькоў (які да чысткі Дзяржынскай партарганізацыі насіў у кішэні партбілет) прадставіў планы зямляўпарадкавання на зацвярджэнне ў РВК. Яго планы былі зацверджаны. У калгасы выехалі зямляўпарадчыкі Ганчароў, Іваш і інш. Яны адарвалі ад работы не адзін дзесятак калгаснікаў для выканання шкодніцкага плана Каралькова, зацверджанага раённым арганізацыямі, з-за палітычнай слепаты кіраўнікоў Вансоўскага, Курэіна, Забалоцца і інш.

Раённае кіраўніцтва дало магчымасць Караль кову весці далей тую справу, якую пачаў у свой час надпомаўскі патэнціцель Прышчэпаў. У раёне Каралькову удалося ўстанавіць каля 14.000 кулацкіх клетак. У Рубліхаўскім сельсавеце было калісці многа кулацкіх хутароў. Там Каралькоў і мерыў клеткі па 20-30 га кожная. А там, дзе калгасы арганізаваны на землях беднацка-серадняцкіх гаспадарак, клеткі адмяраліся ад 3 да 5 га.

Зусім зразумела, чаго хацеў Каралькоў. Ён пад відам устанаўлення севазваротаў у калгасах імкнуўся вызначыць межы кулацкіх хутароў. Хаця гэтыя клеткі нічога агульнага з устанаўленнем севазваротаў не мелі, але-ж райарганізацыі план Каралькова зацвердзілі.

З часу, як была надрукавана пастанова ЦК УсеКП(б) прайшло больш 7 месяцаў, а што мы маем на сёння? У калгасах, якія арганізаваліся з прыпяшчанасткі хутароў і пасёлкаў, сядзібы калгаснікаў перавышаюць 1-2 гектары. І калі ў раёне зямляўпарадкаваныя калгасы (у якіх устаноўлены правільныя севазвароты) можна пералічыць па пальцах, дык на сядзібах калгаснікаў севазвароты ўстаноўлены паўдзіна.

Калгаснік калгаса «Чырвоны баец», Дабрынёўскага сельсавета, Лычкоўскі П. менш усяго цікавіцца работай на калгасным полі. Бачыце, ён занят на сваёй уласнай сядзібе. У яго будынкамі занята зямлі 0,30 га, яравымі —0,10 га, канопляміі 0,02 га, бульбай —0,50 га, агародам — 0,10 га і пад садам 0,07 га. У калгасніка калгаса імя Молатава Коласа Сцяпана было засеяна: азімых 0,30 га, бульбы — 0,58 га, агарода — 0,10 га, сада 0,08 га, пад будынкамі 0,25 га. Яго сусед Колас Мікола сеяў: бульбы 0,55 га, гарода 0,10 га і мае сенажаці — 0,50 га, пад будынкамі — 0,35 га.

У калгасе «Пролетарый», таго-ж Дабрынеўскага сельсавета, самая мінімальная сядзіба гэта ў калгасніка Гейсіка М. Ён засеяў азімых 0,10 га, яравых 0,23, бульбы 0,60, гароліны 0,10. Мінімальнай сядзіба Гейсіка лічыцца ў сельсавеце таму, што ёсць у паўтара разы больш пыя. У калгасе імя Калініна няма такога калгасніка, сядзіба якога не перавышала-б 1,5 гектара, не лічачы той зямлі, якая знаходзіцца пад будынкамі і выгонам для ўласнай жывёлы.

У Дабрынёўскім сельсавеце ёсць 8 калгасаў У асобных калгасах зямельная плошча раўнаецца плошчы, якая знаходзіцца за ўласным карыстанні калгаснікаў. Зусім не дзіва, што калгасы толькі 10 кастрычніка закончылі сяўбу азімых. Ураджай бульбы на калгасных палёх куды горшы, чым у калгаснікаў.

Якасць уборкі бульбы надзвычай нізкая. Самі калгаснікі гаворыць аб тым, што не менш 40 проц. бульбы засталося ў зямлі. І калгасы, замест таго, каб пачаць барацьбу за бараванне і перапрацоўванне бульбы, кацаюцца на сваіх сядзібах, прыводзяць іх у парадак з тым, каб падры

ГЕРМАНІЯ ВЫШЛА З ЛІГІ НАЦЫЙ

Дэкларацыя Гітлера

ПРАГА, 14. (БЕЛТА).

Друк публікуе абалонпаную Гебельсам перад прадстаўнікамі германскага друку дэкларацыю Гітлера, у якой пасля доўгіх запэўніванняў аб германскім «мірналюбі» гаворыцца:

«Афіцыяльныя прадстаўнікі іншых дзяржаў у сваіх публічных прамовах і прамых запэўненнях германскаму міністру замежных спраў і раду германскіх дэлегатаў паведамілі, што сучасная Германія не можа быць прадстаўлена абяцанае роўнаправе».

Дэкларацыя ўказвае, што германскі ўрад бачыць у гэтым «несправядлівую і зняважлівую дыскрымінацыю» і што таму **ГЕРМАНІЯ ВЫХОДЗІЦЬ З ЛІГІ НАЦЫЙ І З КАНФЕРЭНЦЫІ ПА РАЗЗБРАЕННІ.**

ГЕРМАНСКАЯ ДЭЛЕГАЦЫЯ ПАКІНУЛА ЖЭНЕВУ

ЖЭНЕВА, 14. (БЕЛТА).

У сувязі з рашэннем Германіі аб выхадзе з Лігі нацый, германскі дэлегат Коллер паведаміў старшыні Совета Лігі нацый, што ён не зможа быць сёння на чарговым пасяджэнні совета.

Сёння-ж увечары германская дэлегацыя ў Лізе нацый на канферэнцыі па разбраенні **ПАКІДАЕ ЖЭНЕВУ.**

Гендэрсон атрымаў ад Нейрата тэлеграму, якая покуль не апублікавана. У тэлеграме, згодна вестак, указваецца, што Германія, дарэмна прачакаўшы нескалькі гадоў выканання абяцанняў аб разбраенні і ажыццяўленні роўнаправя ва ўзбраеннях, пастанавіла выйсці з канферэнцыі па разбраенні.

РАПТОЎНЫ АД'ЕЗД НАДОЛЬНАГА Ў БЕРЛІН

ЖЭНЕВА, 14. (БЕЛТА).

Паведамляюць наступныя акалічнасці ад'езда Надольнага ў Берлін.

12-га кастрычніка ўвечары Дэвіс прабываў увагадніць з Надольным праект рэзалюцыі трох дзяржаў (Францыі, Англіі і ПАЗШ).

Надольны заявіў Дэвісу і Саймону, што ў выпадку прадстаўлення такога праекта германскаму ўраду ён не ўпэўнен, ці вернецца ён наогул з Берліна.

Затым Надольны зноў паўтарыў паграбаванне Германіі аб прадастаўленні ёй поўнага роўнаправя ў адносінах абарончых відаў зброі. Пасля гэтага Дэвіс і Саймон адмовіліся ад намера прадставіць сумесную рэзалюцыю трох дзяржаў. Адначасова Саймон і Дэвіс заявілі Надольнаму, што чакаюць яснага, выразнага адказа ад Германіі.

***

ПРАГА, 14. (БЕЛТА).

Жэнеўскі карэспандэнт «Прагер Прэсе» піша, што раптоўны ад'езд Надольнага ўспрынят у Жэневе, як сенсацыя, асабліва таму, што Надольны не прыме ўдзела на сённяшнім пасяджэнні бюро канферэнцыі па разбраенні. Адначасова газета падкрэслівае, што ходь пазіцыя трох дзяржаў і не будзе фармальна прыведзена ў выглядзе сумеснага выступлення Францыі, Англіі і ПАЗШ, аднак, тэкст выступлення Саймона ўхвален усімі трыма краінамі.

Германскі друк паведамляе, што Надольны проста з аэрадрома адпраўіўся да Гітлера для даклада.

«Ангрыф» падкрэслівае, што не можа быць і гутаркі аб падпісанні Германіяй канвенцыі, пакуль у канвенцыю не будзе ўнесен пункт аб неадкладным ажыццяўленні германскага патрабавання аб якасным роўнаправі ва ўзбраеннях, г. зн. аб прадастаўленні Германіі права мець усе «абарончыя віды зброі», якія маюць і іншыя краіны.

Роспуск германскага рэйхстага

ПРАГА, 14. (БЕЛТА).

Вольф паведамляе з Берліна: «З прычыны зневажальнага становішча Германіі на канферэнцыі па разбраенні германскі ўрад аб'явіў аб выхадзе Германіі з Лігі нацый. Адначасова германская дэлегацыя пакінула канферэнцыю па разбраенні. Каб даць нацыі магчымасць выявіць свае адносіны да жыццёвых пытанняў германскага народа, прэзідэнт Гінденбург дэкрэтам ад 14-га кастрычніка г. г. распусціў рэйхстаг і ландтагі. Выбары ў рэйхстаг прызначены на 12 лістапада. Намеснікам правінцый прапанавана покуль не праводзіць выбараў у ландтагі».

ВАРШАВА, 14. БЕЛТА).

«Германскае міністэрства замежных спраў паслала старшыні канферэнцыі па разбраенні Гендэрсону наступную тэлеграму: «З прычыны рэзультатаў пошукаў пасяджэння зацікаўленых дзяржаў па пытанні аб разбраенні, стала ясцім лоным, што канферэнцыя па разбраенні не выканае адзінай сваёй задачы — прывядзення ўсеагульнага разбраення. Адначасова становішча ясным, што эрыў канферэнцыі трэба прыпісаць выключна адсутнасці добрай волі моцна ўзброеных дзяржаў на выкананню імі сваіх абавязальстваў у галіне разбраення. Тым самым стала немагчымым прыняцце германскіх патрабаванняў і разам з тым адпаў прынцып, на падставе якога ў пачатку года Германія згадзілася адкласці свой удзел у канферэнцыі па разбраенні. З прычыны гэтага германскі ўрад аказаўся вымушаным пакінуць канферэнцыю па разбраенні».

«ВЫБАРЫ» ПА-ФАШЫСЦКУ

ПРАГА, 15.

Паводле паведамлення агенцтва Косці, адначасова з «выбарамі» ў германскі рэйхстаг адбудзецца парада па пытанні аб замежнай палітыцы ўрада.

Пры «выбарах» будуць фігураваць два бюлетэні: адзін са спісам нацыянал-сацыялістскіх кандыдатаў і другі са словамі: «за» і «не».

КАМЕНТАРЫ ФАШЫСЦКАЙ ПРЭСЫ

ПРАГА, 15. (БЕЛТА).

У першых водгуках германскага друку на ўход Германіі з Лігі нацый і з канферэнцыі па разбраенню пабачаецца поўнае ізаляванне ў міжнародным плане, у яўнай супярэчнасці з імі гаворыцца аб радыкальнай перамене знешня-палітычнага курса Германіі.

Гэта перамена, паводле слоў газет, заключаецца ў замене палітыкі «лістападаўскіх злачынцаў» (палітыка прыхільнікаў Веймара) палітыкай, аб якой гаворыць нацыянал-сацыялістская праграма.

«Берлінер берзен цэйтунг» лічыць, што сваім выхадам з Лігі нацый, Германія вярнула сабе свабоду дзеянняў у той-жа час перад дзяржавамі адкрываецца шлях да больш пасяховага кантакта з Германіяй па-за «атручанай жэнеўскай атмасферай».

«Берлінер берзен кур'ер» адкрыта выказвае трывогу па поваду апошняга кроку Германіі, заяўляючы, што «для германскага народа наступаюць цяжкія часы», якія ён, аднак, здолее перажыць пад кіраўніцтвам «моцнага ўрада».

Каментуючы рашэнне германскага ўрада, цэнтральны орган нацыянал-сацыялістскай партыі «Фелькішэр беабахтэр» публікуе артыкул Розенберга, у якім той піша:

«Цяпер свет мае справу не з разбітай на партыі германскай нацыяй, а з адзіным блокам 70 мільёнаў. Роспуск крайвых парламентаў азначае далейшы крок да ўмацавання адзінства дзяржавы».

У заключэнне Розенберг раіць эўрапейскім дзяржавам не забываць, што «катастрофа ў Германіі немінуча пацягне за сабой катастрофу і ў іншых эўрапейскіх дзяржавах».

Водгукі ў Амерыцы

ВАШЫНГТОН, 14. (БЕЛТА).

Агенцтва «Асашыэйтэд прэс» паведамляе, што пасля атрымання вестак аб уходзе Германіі з канферэнцыі па разбраенні ў міністэрстве замежных спраў была спешна скліканая нарада для абмеркавання пытання аб пазіцыі ПАЗШ.

Паводле слоў агенцтва, «лічыцца, што з прычыны дзеянняў Германіі задача прымірэння стала трудная, калі не немагчымая, хоць тут-жа ўказвалася, што ПАЗШ лапрабуюць падштурхнуць Германію адступіць ад сваёй пазіцыі».

***

ВАШЫНГТОН, 14. (БЕЛТА).

Дзяржаўны сакратар (міністр замежных спраў) ПАЗШ Хэлл заявіў прадстаўнікам друку, што паведамленне аб рашэнні Германіі выйсці з Лігі нацый поўнасцю прыпыняе рух на карысць разбраення. Урад ПАЗШ, — сказаў Хэлл,—«сур'ёзна расчараван і глыбока шкадуе аб падобным развіцці падзей.

АНТЫГЕРМАНСКІ БАЙКОТ У ЗЛУЧАНЫХ ШТАТАХ

Н'Ю-ІОРК, 14. (БЕЛТА).

Антыгерманскі байкот у ПАЗШ узмацняецца. На ўсёй краіне, асабліва ў гарадах з шматлікім яўрэйскім насельніцтвам, гандлёвыя фірмы апублікуюць свае заказы на германскія тавары.

Германскія экспарцёры з мэтай абыйсці байкот, знімаюць са сваіх тавараў ярлыкі, якія ўказваюць на паходжанне тавараў. Падобныя дзеянні парушаецца амерыканскае мытнае заканадаўства. Праводзіцца расследванне.

Працэс аб падпале рэйхстага

ВЫМУШТРАВАНЫЯ „СВЕДКІ"

ПРАГА, 15. (БЕЛТА).

На учарашнім пасяджэнні суда ў Берліне праходзіць допыт групы пажарных, паказанні якіх своеасцца да стэрэатыпных адказаў на такія-ж стэрэатыпныя наводзячыя пытанні старшыні суда, пракурора і «абаронцаў».

Сённяшні дзень асабліва яркі ўкрывае спробу суддзі выгараджаць сапраўдных падпіцеляў справы і суўдзельнікаў Ван дэр-Люббе. Суд з выключнай старанасцю прабуе абвергнуць даныя, апублікаваныя ў «Карычневай кнізе».

Усе пытанні суда пажарным зводзяцца да наступнага: «Ці правільна тое ці іншае сцвярджэнне ў «Карычневай кнізе»? І пажарныя ў адзін голас зазяўляюць, што гаручага ў будынку рэйхстага выяўлена не было, пажарныя часці былі выкліканы своячасова, штурмавіку ў часе пажара ніхто ў будынка рэйхстага ні адзін з пажарнікаў нікогда не бачыў і г. д., і г. д.

Некаторай сенсацыяй было з'яўленне ў сале суда начальніка пажарнай часці Гемпа, які, як відома, кіраваў тушэннем пажара і праз нескалькі дзён у якасці кары за неасцярожныя выказванні быў зволен. Аднак, Гемп не дае звяснага выкладання бачанага і чутага ім, абмяжоўваючыся адпаскладовымі адказамі на пытанні, якія яму задаваліся.

Як і трэба было чакаць ад падпаўшага репрэсіям «сведкі», Гемп абвяргае ўсё, што абвінавачанню патрабуецца абвергнуць. У прыватнасці Гемп абвяргае зробленую ім-жа пасля пажара заяву аб тым, што ў рэйхстагу было выяўлена нескалькі цэнтнераў гаручага матэрыялу. Ён адмаўляе таксама зробленую ім-жа пасля пажара заяву аб тым, што пажарных наўмысла выклікалі вельмі позна. Разам з гэтым Гемп, адчуваючы слабае месца сваіх паказанняў, сцвярджае, што ніхто і ніколі не рабіў на яго націска.

Аднак, ён пры гэтым ні слова не гаворыць, чаму яго раптоўна пасля пажара, дзе пажарныя сябе паказалі вельмі распарадчымі, зволілі са службы.

У заключэнне, згодна патрабавання старшыні суда, Гемп гаворыць, што ён можа пад прысягаю заявіць, што ўсе сцвярджэнні «Карычневай кнігі» не адпавядаюць сапраўднасці.

У канцы сённяшняга пасяджэння старшыня паведамляе, што Дзімітраў зноў дапускаецца ў працэс. Кідецца ў вочы, што неабяспечны для суда сваімі перакрыжаванымі допытамі Дзімітраў быў выключан іменна на тыя пасяджэнні суда дзе дапытваліся важнейшыя сведкі абвінавачання, у прыватнасці Гемп.

НІЧЭМНЫЯ ЎВЁРТКІ АГЕНЦТВА ВОЛЬФ

ПРАГА, 15. (БЕЛТА).

Прабуючы апраўдаць арышт замежных юрыстаў, Вольф паведамляе, што замежныя юрысты з'яўляюцца, несумненна, «асобамі, якія прабраліся на працэс для вядзення комуністычнай прапаганды і скарысталі недастатковае веданне нямецкай мовы замежнымі журналістамі для пашырэння ілжывых паведамленняў аб працэсе».

У процівагу гэтаму берлінскі карэспандэнт чэхаславацкага агенцтва падкрэслівае, што замежныя юрысты не вялі ніякай палітычнай кампаніі.

Берлінскі карэспандэнт «Прагер тагеблат» адзначае выключную грубасць паліцыі да арыштаваных замежных юрыстаў. Паліцыя не дазволіла ім гаварыць з кім-бы там ні было і адправіла іх у палічэй-прэзідыум. Увечары арыштаваных прывезлі ў гасцініцу, спешна прымусілі сабраць рэчы і зноў павезлі, строга наглядаючы, каб ніхто з замежных журналістаў не набліжаўся да арыштаваных.

ПРАВАЛ АБВІНАВАЧАННЯ—ДАКАЗАНЫ ФАКТ

ВЕНА, 14. (БЕЛТА).

Каментуючы учарашнае пасяджэнне суда на справе аб падпале рэйхстага ў Берліне, «Арбайтэр цэйтунг» гіранічна адзначае, што гэты дзень «быў кепскім днём для ладнальнічкаў».

Газета прыходзіць да наступных вываду:

1) Усе сцвярджэнні, на якіх грунтуецца абвінавачанне Торглера ў падпале, няправільны.

2) Ван дэр-Люббе не меў членскага білета кампартыі, як гэта спачатку афіцыяльна сцвярджалася.

3) Ван дэр-Люббе адзін не мог падпаліць рэйхстаг.

4) У момант падпала ў будынку рэйхстага знаходзіўся нейкі дэпутат рэйхстага, імя якога суду хоць і вядома, аднак, старанна замоўчваецца. Відавочна, гэта быў нацыянал-сацыялістскі дэпутат.

СССР і ПАЗШ

Н'Ю ІОРК, 13. (БЕЛТА).

«Кур'ер Джорнэль», якая выходзіць у Люісвілі (штат Кентукі), спачувальна адгукваецца на **ПРАПАНОВУ РУЗВЕЛЬТА ДЗЯРЖАЎНАМУ ДЭПАРТАМЕНТУ ПАДРЫХТАВАЦЬ МЕМАРАНДУМ ПА ПЫТАННЮ АБ ПРЫЗНАННІ СССР.**

На думку газеты, Рузвельт шчыра рыхтуецца прадпрыняць гэты крок, не гледзячы на процідзеянне амерыканскага легіёна і бюракратаў з амерыканскай федэрацыі працы.

— Совецкі ўрад, — заяўляе газета, — устойлівы і прадстаўляе «значную частку насельніцтва». Дзеянні эўрапейскіх краін, прызнаўшых СССР і прадстаўляючых яму крадыты, сведчаць аб тым, што совецкі ўрад заслугоўвае давер'я.

«Прызнанне, — піша газета, — з'яўляецца чыста дзелавым пытаннем. СССР хоча атрымаць у крэдыт тавары. Мы хочам іх прадаць. ПАЗШ мае прэтэнзіі да совецкага ўрада і былых да яго ўрадаў. Рускія ў сваю чаргу маюць прэтэнзіі да ПАЗШ, звязаныя з удзелам ПАЗШ у інтэрвенцыі ў Архангельску і Сібіры. Рузвельт жадае разгледзець рускую праблему шчыра, проста і мэтазгодна. Палітыка совецкага ўрада, рэлігія і ідэі ў СССР не датычаць ПАЗШ».

Газета «Стэйт рэджыстэр» (выходзіць у Стрынкфільдзе, штата Ілінойс) піша:

«З пашфармаваных крыніц перадаюць, што прэзідэнт ужо прыняў рашэнне абмяняцца нотамі з совецкімі дзяржаўнымі дзеячамі і толькі чакае эручнага часу, каб назначыць амерыканскага пасла ў Маскву. Дыпламатычны кантакт і простыя зносіны будуць выключна выгоднымі, калі перагаворы ўвянчаюцца поспехам».

Газета «Пэпэр прэс» піша:

«Лічаць, што Вашынгтон сур'ёзна вывучае пытанне аб прызнанні совецкага ўрада. Фікцыя быццам совецкі ўрад не існуе, не дае Злучаным Штатам нічога. Наадварот, ПАЗШ трацяць капітучэйшы гандаль. Рускія рынкі маршы і абсталявання перададны іншым краінам».

У адказ на разасланую ў канфідэнцыяльным парадку анкету больш 650 газет выказаліся ў карысць неадкладнага безумоўнага прызнання СССР.

Пабудуем ЭСКАДРЫЛЬЮ імя т. КАГАНОВІЧА

На бягучым рахунку 1.011.602 рублі

За 15 кастрычніка на бягучы рахунак Дзяржбанка № 160-7814 паступіла 3.880 рублёў. Ад арганізацый і ўстаноў г. **Менска:** таркасы—156 руб.; мен. МК комс—4 рублі і вызыўнога пункта—99 руб. Паступіла з раёнаў: **Асвейскага**—557 руб.; **Лельчацкага**—273 руб.; **Бягомльскага** — 537 руб.; **Плешчаніцкага**—154 руб.; **Мазырскага**—2003 руб.; **Шклоўскага** —95 руб.

З пачатку збора на бягучы рахунак Дзяржбанка паступіла 1.011.602 рублі.

Не пачалі збора сродкаў

Ход збора сродкаў на пабудову авіяэскадрыльі імя Кагановіча ў Барысаўскім раёне далёка нездавальняючы. Дрэнна са зборам сродкаў па бярозінскаму камбінату, лесазаводу імя Молатава, саюзу працаўсветы і інш. Барысаўскае аддзяленне Саюзтранса, напрыклад, нават яшчэ не прыступіла да правядзення гэтай важнай палітычнай кампаніі.

Надзвычай дрэнна праходзіць збор сродкаў у калгасах, саўгасах і вёсках. Тут не праводзіцца ніякай масава-палітычнай работы ў гэтым напрамку. У выніку гэтага з 26 сельсоветаў унеслі, і то незначныя сумы грошай, толькі 4 сельсоветы (Жэртайскі — 12 руб. і інш.).

Такое становішча са зборам сродкаў тлумачыцца тым, што арганізацыі Барысаўшчыны не ўзначалілі ініцыятывы перадавых пролетарыяў і калгаснікаў, не вядуць работу, каб збор сродкаў закончыць у бліжэйшы час.

Уносяць і выклікаюць

Выклік т. **Радзіонава** прымаю. Уношу 20 руб. на пабудову авіяэскадрыльі і выклікаю т. т. **Маўшовіча** (начпалітаддзела Клімавіцкай МТС); **Веймана** начпалітаддзела Ратачоўскай МТС); **Каменштэйна** (начпалітаддзела Хойніцкай МТС); **Каменштэйна** (начпалітаддзела большэвіцкай МТС, Менскага раёна); **Берзінга** (начпалітаддзела Полацкай МТС); **Ліхезагер** (начпалітаддзела Баб руйскай МТС); **Лукіна** (начпалітаддзела саўгаса «Варонічы», Полацкага р-на); **Макеева** (начпалітаддзела саўгаса Баноць, Полацкага р-на), **Брыгневіча** (начпалітаддзела Жлобінскай МТС) і **Блюмкіна** (нам. начпалітаддзела Жлобінскай МТС).

Плотнін.

На выклік **Радзіонава** уношу 24 рублі ў бягомльскае адд. Дзяржбанка на пабудову эскадрыльі і выклікаю т. т. **Сільвестрава** (Наркамзёмаў), **Красоўскага** (упаўкамзаг. СНК), **Анісава** (сакратар бягомльскага РК КП(б)Б, **Гніляжевіча** (начпалітаддзела МТС), **Бароўкава** (ўпаўкамзаг па Бягомльскаму раёну) і **Шкірманкова** (упаўнаваж. ДПУ).

Шэмлель.

Удзельнікі 2-й ўсебеларускай нарады сушрацоўнікоў сістэмы «Белпушніны» сабралі і ўнеслі на пабудову эскадрыльі імя тав. Кагановіча 114 рублёў.

Гастролі польскага дзяржаўнага тэатра БССР

З 4 па 27 лістапада ў Менску будзе працаваць створаны НКА калі чатырох год назад польскі дзяржаўны тэатр БССР. Дагэтуль польскі тэатр абслугоўваў амаль выключна раёны рэспублікі, і таму гэтыя гастролі з'яўляюцца яго першай спробай паказаць свае дасягнені працоўным чырвонай сталіцы.

У рэпертуары тэатра дзве перакладных п'есы: **«Майстар» Галічніка** (пастаноўшчык — рэжысёр **Піясецкі**) і **«Армія міра»** (у пастаноўцы маладой рэжысуры дзяржаўнага яўрэйскага тэатра — **Трэпеля** і інш.) і адна арыгінальная.

Надаючы вялікае палітычнае значэнне паказам у Менску польскага дзяржаўнага тэатра, гарпрафсавет абавязаў фабзаўмясцкомы разгарнуць масавую растлумачальную работу сярод рабочых і служачых па папулярызацыі гэтага тэатра, правядзячы ў часе абедзенага перапынка гутаркі аб ленінскай нацыянальнай палітыцы і значэнні тэатра ў справе інтэрнацыянальнага выхавання працоўных мас. Фабзаўмясцкомы і гаркомы саюзаў арганізоўваюць масавыя паходы на паказы польскага тэатра.

Тэатрам вылучана спецыяльная брыгада ў складзе лепшых актораў, з уласным аркестрам, для правядзення культвылазак на прадпрыемствы Менска і ў вайсковыя часці.

Праверком і бюро парт. ячэйкі Белжылсоюза паведамляе, што **15-X-1933 г.** у 5 гадзін вечара **ПАЧЫНАЕЦЦА ЧЫСТКА ПАРТ. ЯЧЭЙКІ БЕЛЖЫЛСАЮЗА І БЕЛЖЫЛСТАНДАРТТРЭСТА.**

Запрашаюцца рабочыя і служачыя прадпрыемстваў і ўстаноў, а таксама працаўнікі і актывісты ЖАКТ'аў і ЖБКТ.

Чыстка праходзіць у клубе будаўнікоў (вуліца Энгельса № 18).

Праверком.
Бюро ячэйкі.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР
вул. ВАЛАДАРСКАГА

ДАМЭЦ МЮЗІК-ХОЛ
Сёння 16 кастрычніка
АПОШНЯЯ ГАСТРОЛЬ
ЭЎРАПЕЙСКАГА ІЛЮЗІЯНІСТА
КІО
з яго 18 асістэнтамі.
Новая праграма! — Новыя ілюзіі!
Таксама ўдзельнічае ўся трупа.
Пач. у 8 г. 30 м. вач. Каса—ад 12 г. дня.

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. Гукавы мастацкі фільм 2 СУСТРЭЧЫ

Кіно Інтэрнацыянал КВЕТКА КАХАННЯ

Кіно „Пролетарый" Мастацкі совецкі фільм Цана чалавека драма ў 6 частках

„СПАРТАК" Каса з 4 г. дня. Выдатны трукавы фільм КРЫЛЛІ драма ў 6 частках.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр ДВА ДРУГА МАДЭЛЬ І ПАДРУГА камедыя ў 7 частках

ПРЭЗІДЫУМ ЦП САЮЗА МЕДСАНПРАЦЫ І КАЛЕГІЯ НКАЗ
17 КАСТРЫЧНІКА, у 6 гадзін увечары, у памяшканні аўдыторыі 2-га корпуса Клінічнага гарадка
СКЛІКАЮЦЬ
УСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ
дырэктароў галоўдактэроў, і старшынь ММ гарадскіх больніц
в НАСТУПНЫМ ПАРАДКАМ ДНЯ:
1 Аб рэалізацыі прапаноў камісіі па чыстцы ячэйкі НКАЗ і адозве 1-й менскай больніцы да усіх медработнікаў Беларусі (гл. „Звязду" ад 10-X г.г.
2. Умовы і паказальнікі ўсебеларускага конкурса на лепшую больніцу.
3. Канкрэтызацыя і формы ўліку ўдарніцтва і і соцспаборніцтва.
Прысутнасць трыкутнікаў медустаноў г. Менска абавязкова.
Запрашаюцца медработнікі.
ЦП саюза медсанпрацы. Калегія НКАЗ.

БЕЛАРУСКІ РАБОЧЫ ТЭАТР „САЎГАСРА ОЧЫ"
АБВЯШЧАЕ НАБОР АКТОРАЎ
Заявы і дакументы прымаюцца ў клубе харчавікоў ад 12—2 і ад 4—6 гадз. Іспыты адбудуцца 20 кастрычніка ў клубе харчавікоў у 6 гадз. вечара
ДЫРЭКЦЫЯ.

ПРАДАЕЦЦА
насена 50 пчаліных сямей у рамачных вуллях, гуртам і часткамі, і пустыя вуллі
Звяртацца па адрасу: г. Чавусы, кантора плодагародніны.

Абавязковая пастанова № 23

менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

14 кастрычніка 1933 г. г. Менск.

У МЭТАХ ЛІКВІДАЦЫІ ЎЦЕЧКІ ВАДЫ З МЕНСКАГА ГАРАДСКОГА ВАДАПРАВОДА, МЕНСКІ ГАРАДСКІ СОВЕТ ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Абавязаць усе домакіраўніцтвы ў месячны тэрмін адрамантаваць свае вадаправодныя ўстаноўкі шляхам рамонта і ўрэгулявання работы ўсіх кранаў.

2. Усе студні, у якіх ёсць вадамеры, павінны быць ачышчаны ад бруду і вады, і зачынены шчыльна крышкамі.

3. Вінаватыя ў парушэнні гэтай пастановы прыцягваюцца да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу да 100 рубл., або прымусовым работам да 14 дзён.

4. Нагляд за выкананнем гэтай пастановы ўскладаецца на РС міліцыю і на Вадаканалізацыю.

6. Гэта пастанова ўваходзіць у сілу з часу яе апублікавання.

Старшыня гарадскога совета КАРАНЕЎСКІ.
Сакратар гарадскога совета КАПІЛЕВІЧ.

Абавязковая пастанова № 22

менскага гарадскога совета рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў

14 кастрычніка 1933 г. г. Менск.

Санітарнае становішча вуліц, двароў і месц агульнага карыстання горада Менска, не гледзячы на праведзены месячнік, застаецца ўсё яшчэ нездавальняючым, на падставе чаго менскі гарадскі совет пастанаўляе:

1. Абавязаць старшынь жактаў, загадчыкаў дамамі, камендантаў дзяржаўных устаноў і прамаданых арганізацый, а таксама прыватных домаўласнікаў выпарыць неадкладна поўную ачыстку двароў, вуліц і месц агульнага карыстання, і ў будучым ачыстку провадзіць сістэматычна.

2. Абавязаць органы міліцыі, санітарную інспекцыю праверыць кожную вуліцу, двор, усе месцы грамадзкага карыстання і, пры выяўленні антысанітарнага становішча, персанальна вінаватых прыцягваць да адміністрацыйнай адказнасці — штрафу да 100 руб., або прымусовым работам да 14 дзён.

Больш злосных вінаватых у антысанітарыі перадаваць у суд для прыцягнення да крымінальнай адказнасці.

3. Абавязаць членаў гарадскога совета, прымадаваных да жактаў, на працягу 5-ці дзён праверыць у сваім жак це выкананне гэтай пастановы, і вынікі даводзіць гарсовету.

Старшыня гарадскога совета КАРАНЕЎСКІ.
Сакратар гарадскога совета КАПІЛЕВІЧ.

Беладдзяленне ДАМЭЦ
даводзіць да ведама ўсіх фабкомаў, фабзаўмясцкомаў, мясцкомаў і іншых зацікаўленых арганізацый, што
з 15 кастрычніка г.г. прымаюцца заяўкі
на прадмет абслугоўвання кастрычніцкіх дзён канцэртна-эстрадными сіламі артыстаў ДАМЭЦ.
Пры падпісанні дагавора вышэйказаныя арганізацыі павінны даць сваім прадстаўнікам даверанасці на права падпісання дагавора.
Заяўкі прымаюцца штодзенна, з 11 г. ран. да 4-х дня, у ДАМЭЦ. (Універсытэцкая, 12, клуб металістаў, тэл. 22-755).
БелДАМЭЦ.

Бабруйская школа ФЗВ лесакамбіната
абвяшчае набор вучняў на 1933-34 навуч. год у ліку 120 ч. У школу прымаюцца дзеці рабочых, служачых, калгаснікаў і ў першую чаргу ўдарнікаў дрэваапрацоўчай прамысловасці, пераважна з скончыўшых семігадовую школу, але не ніжэй 5-ці груп, ва ўзросце не ніжэй 16 год. Усе прынятыя забяспечваюцца інтэрнатам: харчовае забеспячэнне па 1 спісу I кат.; зарплата па пасяховасці; пры школе ёсць сталоўка.
Да заяў трэба дадаць наступныя дакументы: аб адукацыі, аб нарадженні, аб сац. становішчы. Заявы і дакументы накіраваць у канцылярыю школы да 25 кастрычніка 1933 г. па адрасу: г. Бабруйск, лесакамбінат, школа ФЗВ. Падаўшым дакументы з 1 ліпіца 26, 27 і 28 кастрычніка 1933 г. Заняткі пачнуцца 1 лістапада 1933 г.
Дырэкцыя.

АДКРЫТ ПРЫЁМ
на 3-месячныя падрыхтоўчыя КУРСЫ
ў Магілёўскі педінстытут імя М. М. Пакроўскага.
На курсы прымаюцца асобы, скончыўшыя 8 груп сав. школы або раўналежныя ім установы, і асобы, маючыя незакончаную сярэднюю адукацыю, але вытрымаўшыя іспыты за 8 груп. Прыём заяў да 1 лістапада. Заняткі пачынаюцца 1-га лістапада. Да заявы далучваюцца наступныя дакументы: даведка аб сац. паходжанні і сац. становішчы; заверная анкета, метрычная даведка, даведка аб адукацыі, аб адносінах да вайсковай павінасці. Заявы прымаюцца ў канцылярыі педінстытута (г. Магілеў, Ленінская 35).
Дырэкцыя.

ЗАКЛЮЧНЫ БАЛАНС

МЕНСКАЙ ГАРАДСКОЙ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫІ

АКТЫЎ — на 1-е студзеня 1933 г. — ПАСІЎ

№	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума: Прыватная	Сума: Агульная
I	**Маемасць**		
	1. Будынкі і будоўля	1.154.781 72	
	2. Абсталяванне і машыны	3.740.461 59	
	3. Інструмант	30.196 35	
	4. Гаспадарчы інвентар	65.552 30	
	5. Транспарт	374.118 39	5.365.110 35
II	Запасное абсталяванне	—	78 635 80
III	Нясканчанае будаўніцтва	—	66.049 58
IV	Капітальн. рамонты	—	31.910 53
	РАЗАМІ I—IV	—	5.541.706 26
V	**Матэрыялы**		
	1. Паліва	298.804 37	
	2. Розныя матэрыялы	416.270 07	715.074 44
VI	Нясканчаныя мантажн. работы		14.861 26
VII	**Грашовыя сродкі**		
	1. Каса	542 57	
	2. К.-банк па разліках	68.494 —	
	3. „ па капбудаўніцтву	2.882 32	
	4. Бягучы рах. у ашчадкасе	3.445 23	75.364 57
VIII	Каштоўныя паперы	10.025 —	
IX	Паі і акцыі	5 673 20	15.698 20
X	Падспраўздачныя сумы		640 72
XI	**Разрахункі**		
	1. Рабочыя і служачыя	7.946 74	
	2. Дастаўшчыкі і падрадчыкі	141.302 81	
	3. Спажыўцы і пакупнікі	576.921 56	
	4. Дэбіторы розныя	530.03 02	779.174 13
XII	Выдаткі будуч. гадоў		66.831 92
XIII	Гарфэ па адл. ад прыбыткаў		382.042 75
XIV	Сельска-гасп. ферма		76.698 79
	БАЛАНС		7.668.093 04

№	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума: Прыватная	Сума: Агульная
I	**Капіталы**		
	1. Статутны	5.193.258 41	
	2. Амартызацыйны	806.844 72	6.000 103 13
II	**Фонды**		
	1. Фубр	56.707 98	
	2. Фонд прамівання	11.820 —	68 527 98
III	Камунбанк па к.-тэрм. пазыках		362.000 —
IV	**Разлікі**		
	1. Рабочыя і служачыя	59.700 25	
	2. Дастаўшчыкі і падрадчыкі	129.830 28	
	3. Спажыўцы і пакупнікі	58.238 33	
	4. Розныя крэдыторы	147.760 06	395.528 92
V	Змены статутн. капітала		96.062 17
VI	**Вынікі**		
	1. Прыбытак		745.780 84
	БАЛАНС		7.668.093 04

РАХУНАК

страт і прыбыткаў за 1932 год

СТРАТЫ — ПРЫБЫТКІ

№	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума: Прыватн.	Сума: Агульная
1.	Процанты аплочаныя	„	17.257 96
2.	Адлічэнні ў фонд прамівн.	„	25.450 84
3.	Страты ад экспл. жыл. дома	„	2.870 —
4.	Выдаткі па судпастановах	7.858 54	
5.	„ па абслугоўв. абанем.	22.977 25	
6.	„ за аб'явы ў газетах	5.259 79	
7.	„ Розныя	15.177 69	51.273 27
8.	Безнадзейныя даўжнікі	1.121 —	
9.	Дэбітарск. запазыч. за мін. гады	109.763 33	110.884 33
10.	Выдаткі па падрыхт. кадраў		34.507 32
	Разам		242.243 72
	Чысты прыбытак		745.870 84
			988.114 56

№	НАЗВА АРТЫКУЛАЎ	Сума: Прыбыт.	Сума: Агульная
1	Ад рэалізац. эл. энергіі	„	942.450 62
2	Процанты атрыман.	„	1.303 36
3	Пені і пяўстойкі	„	36.590 92
4	Рэаліз. адкідаў	„	212 01
5	За арэнду памяшкан.	„	2.100 —
6	Лішак мат. і розн. у цане	„	5.414 58
7	Розныя прыбыткі	„	48 07
			988.114 56

Дырэктар электрастанцыі **СУХАРУЧКІН.**

Галоўбух **АДМОС.**

Менск, друкарня «Звязды».

Галоўлітбал № 337.